

БЕЛАРУСКАЯ ДУМКА

ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНЫ

І ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ ЧАСАПІС

BYELORUSSIAN THOUGHT

THE BYELORUSSIAN OUTLOOK
ON
SOCIETY, POLITICS, LITERATURE AND ARTS.

№ 36

1991

НЬЮ ЁРК САЎТ РЫВЭР

БЕЛАРУСКАЯ ДУМКА

ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНЫ І ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ ЧАСАПІС

BYELORUSSIAN THOUGHT

THE BYELORUSSIAN OUTLOOK
ON SOCIETY, POLITICS, LITERATURE AND ARTS

Год выд. 31 | 1991 | № 36

72-я ўгодкі 25-га Сакавіка

(Рэфэрат, прачытаны на ўрачыстай Акадэміі 25 сакавіка 1990 г.)

Паважаныя госьці, дарагія суродзічы!

Сёньня мы адзначаем 72-я ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці нашае Бацькаўшчыны Беларусі. 72 гады назад, пасьля развалу калішняе расейскае імпэрыі, беларускі народ аднавіў сваю самастойнасьць, абвяшчаючы ўсяму сьвету, што ён хоча быць гаспадаром у сваёй роднай хаце.

Пасьля ўтраты свае дзяржаўнасьці ў форме Вялікага Княства Літоўскага, беларускі народ ня раз падымаўся на барацьбу супраць пануючай на яго землях чужой улады, каб адваяваць сваё, Богам дадзенае права на незалежнае, як эканамічнае, так і палітычнае жыцьцё. Барацьба беларускага народу за сваю самастойнасьць становіцца асабліва адчыненай толькі ў XIX стагодзьдзі. Гэта, аднак, не гаворыць пра нацыянальную абыякавасьць беларускага народу ранейшых часоў. Да канца XVIII стагодзьдзя амаль усе народы Эўропы былі пад уплывам ідэяў універсалізму, зь яго веру ў перамогу дабра над злом у сьвеце, яго зацікаўленасьцю духовым жыцьцём людзкасьці, а не выключна нацыянальнымі пытаньнямі паасобных народаў.

Яшэ на пачатку XIX стагодзьдзя такі сёньня патрыятычны народ, як Немцы, ня быў, у сёньняшнім разуменьні, поўнасьцю нацыянальна сьведамы. Ў 1808 годзе нямецкі патрыёт філёзаф Ёган Фіхтэ ў сваім творы "Зварот да нямецкае нацыі" ("Reden an die deutsche Nation") заклікаў Немцаў да еднасьці, да зразуменьня сябе, як аднаго народу.

У XIX ст. на месца ўнівэрсалізму прыходзіць новая зацікаўленасьць чалавекам і яго жыцьцём. Яна прывяла да паўстаньня новага гістарычнага руху, які даў сябе адчуць у кожнай галіне думкі й культуры. Гэтая зацікаўленасьць, павязаная з рамантычным духам прыгодаў і вынахадаў, прывяла да паўстаньня новае эры, у якой месца ўнівэрсалізму заняў рамантызм. Пачынае разьвівацца навука й тэхніка, падымаецца нацыянальнае пытаньне, якое становіцца сутнасьцяй палітычнага жыцьця Эўропы ў XIX стагодзьдзі. У Эўропе наступае палітычная вясна. Людзкасьць кіруецца гётаўскім прынцыпам "быць чалавекам — гэта значыць быць барацьбітом". Да Эўропы прыходзіць шэраг паўстаньняў, якія мелі выразна палітычны характар. Сярод іх на асаблівую ўвагу заслугоўвае беларускае паўстаньне пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага ў 1863 годзе. Паўстаньне было яскравым выявам барацьбы нашага народу за сваё нацыянальнае вызваленьне. Сваёй самаахвярнай працай і нязгасным каханьнем да свае Бацькаўшчыны, "Марыські-Беларусі", і свайго народу, Кастусь Каліноўскі зрабіў вялікі ўплыў на разьвіцьцё грамадзка-патрыятычнай думкі на Беларусі. Ён парваў путы панаваньня векавой няпраўды над сваёй Бацькаўшчынай, распаўсюдзіў у народзе ўсьведамленьне, што беларускі народ роўны зь іншымі народамі, што ён павінен мець лепшую долю, што ён нацыя, якая ў цяжкія часы свае гісторыі вымірала ад рук чужынцаў, але не памерла.

Першая сусьветная вайна, а пасьля рэвалюцыя ў расейскай імпэрыі ў 1917 годзе, даюць магчымасьць беларускаму народу дамагацца звароту адабранае ад яго дзяржаўнасьці. 25 сакавіка 1918 году Рада Беларускай Народнай Рэспублікі абвясьціла Беларусь вольнай і незалежнай дзяржавай. Ажыцяўляюцца доўгатрывалыя імкненьні нашага народу й аднаўленьне беларускай дзяржавы становіцца фактам. Аднак, на вялікі жаль, нашаму народу не даводзіцца быць незалежным на працягу доўгага часу. Не хацеўшы пагадзіцца з тым, што іхняя імпэрыя разваліваецца, бальшавікі пусьцілі ў ход усё, каб спыніць разьвіцьцё маладой беларускай дзяржавы. У сьнежні 1918 году яны акупоўваюць значную частку Беларусі. Ад самае рэвалюцыі й да сёньняшняга дня іхнім падыходам у адабраньні ад нерасейскіх народаў волі ёсьць выкарыстаньне жорсткае фізычнае сілы з аднаго боку і хлусьні й ашуканства, з другога. Адным зь першых крокаў бальшавіцкага ашуканства ў адносінах да Беларусі было стварэньне ў студзені 1919 году фікцыйнае беларускае дзяржавы ў форме гэтак званай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Бальшавіком трэба было ашукаць вонкавы сьвет і стварыць бачнасьць незалежнасьці Беларусі.

У 20-х гадох, калі гаспадарка новае расейскае імпэрыі ляжала ў руінах, калі ў краіне панаваў голад і холад, савецкая ўлада была вымушана зрабіць тактычны крок назад і ўвесьці ў жыцьцё так званую новую эканамічную палітыку, пры якой сяляне заахвочваліся да разьвіцьця іх гаспадарак, падтрымлівалася дробнае прыватнае прадпрыемніцтва. Бальшавікі ведалі, што не бязглуздыя ідэі неадкладнае будоўлі "камуністычнага грамадзтва", а толькі пачуцьцё ўласнасьці і ініцыятыва жыхарства змогуць падмацаваць гаспадарку краіны. Адначасова было дазволена разьвіцьцё нацыянальных культураў, у прыватнасьці беларускай. Беларуская мова ўводзілася ў карыстаньне ў адміністрацыйных установах, школах, тэатрах.

Але вось наступілі крывавыя гады — 1929, 1930, 1931... Пайшлі зь Беларусі бясконцыя таварныя цягнікі ў бок халоднае поўначы, Уралу і сібірскае тундры. Яны везьлі на вынішчэньне тысячы і тысячы працавітых беларускіх сялянаў. Пакацілася хваля арыштаў беларускіх пісьменьнікаў, паэтаў, настаўнікаў, інжынераў, мастакоў, навукоўцаў. Нішчыліся помнікі беларускай культуры і мастацтва. Наступіла жорсткая, халодная зіма на нашай Бацькаўшчыне.

Такой зімой у маладосьці
У дваццаць тры мае гады
Патрапіла у Сібір я ў госьці
З усенароднае бяды, — пісала беларуская паэтка Яўгенія Пфляўмбаў.

Так, гэта была сапраўдная ўсенародная бяда, памеры якой нават цяжка сабе ўявіць. У нядаўніх савецкіх крыніцах падаецца, што ў 30-х гадох было вывезена зь Беларусі 1 мільён 629 тысяч чалавек, — і гэта пры насельніцтве ў тагачаснай падсавецкай частцы Беларусі ў 5 мільёнаў. Гэта значыць, што трэцяя частка ўсяго насельніцтва гэтае, з дазволу сказаць, сувэрэннае дзяржавы была выкінута з родных мясьцінаў.

Калі на пачатку 30-х гадоў у Саюзе Пісьменьнікаў БССР было звыш 100 паэтаў і пісьменьнікаў, дык у канцы гэтых крывавых гадоў СП паменьшыўся, паводля Васіля Быкава, да двух дзесяткаў сяброў. Было зьнішчана больш як 50 беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў. Сярод іх і Адам Бабарэка, Міхась Багун, Сымон Баранавых, Даніла Васілеўскі, Анатоль Вольны, Платон Галавач, Уладыслаў Галубок, Цішка Гартны, Максім Гарэцкі, Сяргей Дарожны, Алесь Дудар, Міхась Зарэцкі, Васіль Каваль, Лукаш Калюга, Тодар Кляшторны, Валеры Маракоў, Міхал Мялешка, Янка Нёманскі, Мікола Нікановіч, Язэп Падабед, Міхайла Піятуховіч, Сяргей Ракіта, Васіль Сташэўскі, Юлі Таўбін, Уладзімер Хадыка, Міхась Чарот, Васіль Шашалевіч, Аляксандар Шлюбскі, Паўлюк Шукайла і іншыя і іншыя. Столькі-ж паэтаў і пісьменьнікаў сядзела ў турмах, альбо было выслана на Калыму, Салаўкі і Варкуту, каб адтуль ніколі ўжо больш не вярнуцца, альбо калі й вярнуцца, дык быць назаўсёды пакалечанымі, як фізычна, так і духова. Сярод іх гэта й Алесь Вечар, Юрка Гаўрук, Міхайла Грамыка, Клім Грыневіч, Тодар Доўгапольскі, Уладзімер Дубоўка, Алесь Звонак, Міхась Кавыль, Сьцяпан Ліхадзіеўскі, Уладзімер Мяжэвіч, Алесь Пальчэўскі, Язэп Пушча, Масей Сяднёў, Рыгор Хацкевіч, Мікола Хведаровіч, Кузьма Чорны і іншыя і іншыя. Усіх гэтых нашых пакутнікаў не пералічыш.

Зноў, як і за часоў расейскага царызму, беларуская мова ў гарадох рабілася ўвасабленьнем некультурнасьці і ніжэйшасьці. У беларускую мову пачалі былі ўводзіць савецкія "карэктывы", набліжаючыя яе да мовы

"старэйшага брата". Зусім нэўтральны, альбо можа нават пахвальны тэрмін "нацыяналыны дэмакрат" быў ператвораны ў чужы для Беларусаў сурагат "нацдэм" з наданьнем яму сэнсу здрады й злачынства. Паўстаў ганебны канфармізм, які намагаўся ператварыць наш лагодны народ у савецкага робата. Пачалі былі зачыняцца беларускія школы і замяняцца расейскімі. У сыніку ўсяго гэтага ў беларускіх гарадох не засталося было ніводнае беларускае школы. Нават беларуская вёска, гэтая спрадвечная калыска беларускае нацыі, сыстэматычна русыфікавалася. Дазвол на карыстаньне беларускаю мовай застаўся быў толькі ў некалькіх газэтаў, ды Саюзе пісьменьнікаў БССР.Наша Бацькаўшчына была даведзена да мяжы страты свае культуры, мастацтва і свае мовы. Упяршыню ў гісторыі Беларусі паўстала была пагроза існаваньню нашага народу, як нацыі.

Гісторыя, аднак, паўтараецца. Гаспадарка савецкае імпэрыі развальваецца. Савецкі эканамічны воз беспадзейна загразе у камуністычным балоце. Савецкаму саюзу зноў патрэбныя замежныя крэдыты і тэхніка. Накшталт 20-х гадоў нэпаўшчыны, савецкі ўрад абвяшчае палітыку публічнасьці і перабудовы, прыпраўленае, як і раней, вялікаю дозаю хлусьні і круцельства. Было дазволена пісаць нават праўду, вядома далёка няпоўную, пра існуючы стан у краіне, паколькі гэтай праўдай не крытыкуецца камуністычны падмурак і найвышэйшае кіраўніцтва савецкае дзяржавы. Паняволеныя народы пачалі пакрысе варушыцца. Спачатку народы прыбалтыцкіх краінаў, а пасьля і Беларусы пачалі дамагацца права на сваё роднае імя й роднае слова.

Авангардам сёньняшняга адраджэнскага руху на Беларусі сталіся беларускія пісьменьнікі, паэты і, галоўнае, беларуская моладзь. Моладзь цікавіцца сваёй праўдзівай гісторыяй і культурай. Яна дамагаецца аднаўленьня беларускіх школаў. Расьце сьведамасьць беларускага народу, гартуецца яго нацыянальны дух. Прыкладам гэтага быў шматтысячны мітынг жыхароў Менску 30 кастрычніка 1988 году, каб адзначыць дзень памяці "Дзяды". Нягледзячы на публічнасьць, мітынг быў гвалтоўна разагнаны. Арыштоўваючы жанчын, міліцыя выкручвала ім рукі, калі іх вопратка была бела-чырвона-белага колеру, занадта нацыяналістычнага для міліцэйскага густу, прыгадваючага, бачыце, нацыянальны сьцяг незалежнай Беларусі. Наіўна думаць, што жорсткая расправа зь менскімі дэманстрантамі была задумана мясцовымі ўладамі без пагадненьня з Масквой, альбо без атрымань ня ад яе загаду. Тым больш, што гэтакі-ж гвалт быў учынены ў мінулым 1989 годзе, на гэты раз у Берасьці.

Пасьля чарнобыльскай катастрофы ў атмасфэры ўтварылася вялічэзная хмара, якая пад уплывам ветру рухалася на поўнач над Гомельшчынай і Магілёўшчынай. І калі вецер падуў на ўсход, стварыўшы небясьпеку для імпэрскага цэнтру, савецкія перабудоўшчыкі штучным узьдзеяньнем на гэтую хмару, вытрасьлі зь яе на беларускія палі, рэчкі, лясы й лугі ўсю яе атруту, якая зьнішчыла не толькі землі, але і зрабіла непапраўную шкоду нашым людзям, атруціла як дарослых, так і дзяцей. Афіцыйная Масква ўсё яшчэ хавае праўду пра гэтае злачынства

Зьбірае сьмерць апошніх продкаў,
У небе цягнуцца крыжы,
Сыны-ж усе радзей ва ўгодкі
Прыходзяць на ўспамін душы.
Іх пазганялі з родных гнёздаў,
Што тых калмыкаў, ці татар —
Жуда, бязпамяцтва, бязроднасьць
Дратуюць сэрца і абшар —

пісаў нядаўна сучасны беларускі паэт Леанід Яўменаў, гледзячы на магілы сваіх атручаных братоў. Вось вам перабудовачная публічнасьць і нашая беларуская рэчаіснасьць!

У апошні час у нас на Захадзе створана нейкая такая незразумелая эўфорыя навакол Гарбачова і яго перабудовы. Людзі забываюцца, што Гарбачоў, як і савецкія лідэры перад ім, кажучы пра дэмакратызацыю, упарта фармалюе сваю мадэль грамадзтва і накідае гэтую мадэль усім народам імпэрыі. Да цяперашняга часу толькі аднаму яму дазволена крытыкаваць найбольш важныя аспэкты дзейнасьці савецкага кіраўніцтва. Цяпер, у час публічнасьці, можна пісаць праўду толькі пра Сталіна, Хрушчова, Брэжнева, ну яшчэ, скажам, пра Івана Грознага. У Савецкім саюзе ўсё робіцца ня так, як у другіх народаў, у якіх крытыкуецца сучаснасьць, каб палепшыць будучыню. Як і раней, гісторыя ў Савецкім саюзе разглядаецца людзьмі, якія ня рыюцца ў архівах, шукаючы праўды. Яна ўсё яшчэ пастанаўляецца на паседжаньнях вышэйшых партыйных камітэтаў. Савецкі ўрад яшчэ ня зрокся ідэі, каб перарабіць гісторыю ў прыладу для наданьня легітымнасьці захвату ўлады і ўстанаўленьню савецкай сыстэмы сярод нерасейскіх народаў. Яшчэ гэтым урадам не было сказана, што народы з рознымі куль-

турамі былі сілком заціснуты ў адзін вялікі савецкі канглямэрат, які быў збудаваны на масавым гвалце і цэнтралізаваным кантролю ня толькі людзкіх паводзін, але й людзкой думкі. Зьнішчыўшы незалежнасьць Літвы, савецкі лідар мае адвагу вымагаць выкупу ад літоўцаў і запалохваць іх за іх жаданьне здабыцьця волі. Няўжо-ж ён не памятае, што ён ёсьць кіраўніком тае дзяржавы і тае палітычнае партыі, якая зьнішчыла больш людзей (у тым ліку й літоўцаў) у сваёй імпэрыі, чым якая-колечы іншая ўлада за ўсю гісторыю чалавецтва. Аднак заходні сьвет вядзе сябе так, як быццам-бы Савецкі саюз сапраўды становіцца ўзорам дэмакратычнасьці й волі.

І ўсё-ж, нягледзячы на пагрозы і пагромы, будзіцца сьведамасьць нашага народу, у змаганьні гартуюцца барацьбіты за лепшую будучыню свае Бацькаўшчыны. Нішто ня зломіць вызваленчага духу нашага народу, як не зламала духу нашай вялікай патрыёткі-паэткі Ларысы Геніюш, якая пісала гэтыя радкі ў далёкіх сібірскіх лягерох няволі:

Ад сьлёзаў народных разьліву,
Ад гора саламяных стрэх,
Замоўк мой калісьці шчасьлівы
Жаноцы рассыпчаты сьмех
Так, я ня ўмею сьмяяцца,
Праменную радасьць змаглі,
Усё-ж умею, як волат змагацца,
Каб людзі сьмяцца маглі!

Нягледзячы на кпіны царскіх столаначальнікаў зь Беларусаў і беларускае мовы; нягледзячы на зачыненьне й забарону вышэйшых навуковых установаў на Беларусі за царскіх часоў; нягледзячы на зьдзек і масавае зьнішчэньне беларускага сялянства савецкаю сыстэмаю, нячуваны ў гісторыі чырвоны тэрор над беларускай інтэлігэнцыяй; нягледзячы на зачыненьне беларускіх школаў і вынішчэньне помнікаў беларускай культуры й мастацтва — нягледзячы на ўсё гэта, імкненьні беларускага народу да здабыцьця волі й аднаўленьня незалежнае беларускае дзяржавы, да ажыцяўленьня ідэалаў акту 25 Сакавіка, не памерлі. Яны ніколі не памруць! Праўда пераможа — на тое-ж яна й праўда! Беларусь адваюе сабе волю! Яна будзе незалежнай!

Расьціслаў Завістовіч

РЭЗАЛЮЦЫЯ

XI-га Канґрэсу Беларусаў Амэрыкі, прынятая 2 чэрвеня 1990 году, Саўт Рывэр, Н. Дж.

Мы, амэрыканцы, беларускага паходжаньня, як прыехаўшыя, так і тут народжаныя, ужо ўраслі ў структуру амэрыканскага быту, акліматызаваліся і шчыра працуем амаль у ўсіх галінах амэрыканскага, грамадзкага, рэлігійнага, эканамічнага і палітычнага жыцьця. Аднак мы, эмігранты, ня можам забыць краіну нашага паходжаньня Беларусь. Глыбокім сумам і абурэньнем напаўняе нашы сэрцы і думы той стан, у якім Беларусь знаходзіцца. Чырвоныя акупанты "сувэрэнную" БССР здэнацыяналізавалі а дзесяцігодьдзямі тэрарызаваны народ давялі да галечы і духовага заняпаду. Праступна-абыякавыя адносіны маскоўскіх сатрапаў і іх услужлівых беларускіх рэнэгатаў да чарнобыльскай катастрофы спрычыніліся да таго, што пасьля чатырох гадоў беларусы змушаны жыць на заражанай радыянуклідамі тэрыторыі. Штучнае паўстрымоўваньне перасяленьня з заражанай зоны і сьвядома-хлусьлівыя інфармацыі аб велічу "чорнай сьмерці", вечна ня могуць трываць: ужо стала вядомым, што ў забруджаных раёнах Беларусі значна павысіліся захворваньні, асабліва сярод дзяцей.

Мы выказваем сваё глыбокае спачуваньне беларускаму народу, асабліва суродзічам, якія пацярпелі ў чарнобыльскай катастрофе, а таксама жадаем посьпеху ў аднаўленьні сувэрэнных правоў.

Са свайго боку мы будзем старацца, па меры нашых магчымасьцяў, падтрымліваць БНФ "Адраджэньне" і іншыя патрыятычныя арганізацыі на Беларусі, дапамагчы ахвярам Чарнобыля ў форме мэдыкамантаў, мэдычных прыладаў і іншым.

Зважаючы на заходзячыя перамены на Бацькаўшчыне, заклікаем усіх беларусаў і амэрыканцаў беларускага паходжаньня падтрымаць змаганьне Беларускага Народу за дэмакратыю і нацыянальнае адраджэньне ўсімі магчымымі сродкамі.

Жыве Беларусь!

Сакратары Канґрэсу
Міхась Сенька, Васіль Шчэцька

Старшыня Канґрэсу
Кастусь Мерляк

Ліст у ЦК кампартыі

Беларускія пісьменьнікі-камуністы, як паведамляе газэта "Літаратура і мастацтва" ад 5 кастрычніка 1990 г., напісалі "Адкрыты ліст" у ЦК кампартыі Беларусі, у якім пытаюць: "Каму, якому народу служым?" Аўтары ліста абвінавачваюць кампартыю ў тым, што яна ня служыць беларускаму народу, а Маскве. У другім лісьце, зьмешчаным у "Ліме" №42, пісьменьнікі з горычу канстатуюць, што "спадзяваньняў, бадай, няма" на тое, каб ЦК кампартыі "перабудаваўся", а таму яны, у знак пратэсту, прыпынілі сваё сяброўства ў кампартыі.

Такі мужны крок зрабілі наступныя пісьменьнікі:

Вячаслаў Адамчык, Серафім Андраюк, Анатоль Вярцінскі (сябра Рэдкалегіі ЛІМ-у) Ніл Гілевіч, Уладзімер Гніламёдаў (сябра Рэдк.), Алесь Жук (сябра Рэдк.) Сяргей Законьнікаў, Васіль Зуёнак, Віктар Каваленка, Віктар Казько, Уладзімер Калесьнік, Галіна Каржанеўская (сябра Радк.), Анатоль Кудравец, Максім Лужанін, Мікалай Матусоўскі, Уладзімер Някляеў (сябра Рэдк.), Пімен Панчанка, Барыс Сачанка (сябра Рэдк.), Максім Танк, Іван Шамякін, Іван Чыгрынаў і Анатоль Грачанінаў.

Хто наступны?..

ПАСТАНОВА ПОЛЬСКАГА СЭНАТУ
ад 3 жніўня 1990 г.

Да Народу Беларускага з нагоды праклямаваньня дзяржаўнай суварэннасьці БЕЛАРУСІ.

Стоячы на грунце права народаў да незалежнасьці, з радасьцю вітаем агалошаную 27 ліпеня 1990 г. дэкларацыю дзяржаўнай суверэнасьці Беларусі, як выраз імкненьня народу беларускага да вольнасьці.

Палякі, для каторых вольнасьць і незалежнасьць бацькаўшчыны зьяўляюцца паважнымі вартасьцямі, поўнасьцю разумеюць той важны момант у гісторыі Беларусі — суседа, зь якім імкнёмся жыць як роўныя і блізкія сабе народы. Па абудва бакі нашай мяжы жывуць мяшканцы, якія паходзяць з народаў польскага і беларускага. Маем надзею, што наша сужыцьцё будзе адбывацца ў адпаведнасьці з найлепшымі традыцыямі даўнейшай Рэчы Паспалітай, яе талеранцыі і сужыцьця шматлікіх культураў. Імкнёмся разьвіваць з Беларусьсю супрацу ўва ўсіх дзялянках жыцьця.

Жадаем беларускаму народу, пазбаўленаму праз шмат гадоў уласнай дзяржаўнасьці, каб мог свабодна вырабляць уласны твар і ўмовы жыцьця, а таксама крочыць да лепшай будучыні.

19-я Сустрэча Беларусаў...

1-3 верасьня г. г. ў Кліўляндзе адбылася "Сустрэча Беларусаў Паўночнай Амэрыкі. На зьезьдзе прысутнічалі адзіночныя госьці із Эўропы і Аўстраліі. Сустрэчу "ушанаваў" сваёй прысутнасьцю Генадзі Бураўкін, шэф сталай місіі БССР пры Аб'яднаных Нацыях, той самай місіі, якая яшчэ нядаўна абзывала арганізатараў зьезду ды наагул усіх беларускіх эмігрантаў — фашыстамі, нямецкімі калябарантамі ды іншымі, ня вельмі культурнымі эпітэтамі.

Арганізатары зьезду адпаведна віталі "шаноўнага госьця" і зьмясьцілі інтэрвю зь ім усягна з ягонай фатаграфіяй у сваім ворагане "Беларусе".

Зьезд адбыўся ў нядаўна выканчаным прыгожым будынку, збудаваным мясцовай беларускай калёніяй, каторай за гэта належыцца прызнаньне і ўдзячнасьць.

Гэты новы будынак быў амаль адзінай атракцыяй імпрэзы, зладзіўшых яе палітычна-грамадзкіх арганізацыяў, бо рэшта сустрэчы насіла хутаранска-парахвіяльны характар.

Зьезд закончыўся прыняцьцем даволі цікавай рэзалюцыі і ў сваім сэньсе даволі характэрнай. Рэзалюцыя сапраўды цікавая ўжо

хаця-бы нават тым, што яна высьвятляе праўдзівыя сучасныя ідэалёгічныя сьцежкі-дарожкі яе аўтара.

Сьцежкі-дарожкі ў рэзалюцыі ды прысутнасьць на зьезьдзе афіцыйнага прадстаўніка савецкай Беларусі кідаюць даволі няцікавае сьвятло на ідэалёгічны бок арганізатараў імпрэзы. Цікава, як чуліся на зьезьдзе і чуюцца пасьля яго тэстамэнтовыя прэтандэнты на беларускую дзяржаўнасьць па лініі г. зв. БНР?

Ці запросіны і прысутнасьць на зьезьдзе афіцыйнага прадстаўніка ўраду БССР не азначае прызнаньне імі "дэ юрэ" савецкай беларускай дзяржавы?

Трэба сьцьвердзіць, што цікавасьць рэзалюцыі і нацыянальная вартасьць яе аўтараў ляжыць ня гэтулькі ў тым, што ў ёй зьмешчана, колькі ў тым, чаго із вядомых прычынаў яе аўтары ня мелі цывільнай адвагі ў ёй зьмясьціць, альбо ім інакш яе зрэдагаваць ня было дазволена.

Зь беларускага нацыянальнага пункту гледжаньня — "абое рабое"..

Хай дазволена будзе нам затрымацца крыху шырэй над гэтым, даволі важным для беларускай палітычнай эміграцыі ды нават для ўсяго беларускага народу, пытаньні.

1. У рэзалюцыі няма ня толькі пратэсту, але нават успаміну аб зьліквідаваных савецкім рэжымам сотняў тысячаў беларускай творчай інтэлігэнцыі, частка масавых магілаў каторых была знойдзена нядаўна ў Курапатах і іншых мясцовасьцях. А колькі ня знойдзена?..

2. Няма ў ёй пратэсту супроць адсутнасьці ў быццам беларускай дзяржаве-БССР — беларускага школьніцтва ды супраць дзікай русыфікацыі беларускага насельніцтва расейскімі школамі, адміністрацыяй ды расейскай праваслаўнай царквою.

3. Не падаецца ў рэзалюцыі сапраўднага аўтара і праўдзівай прычыны апублікаваньня шырока рэклямаванай у СССР і вонкі яго г. зв. "сувэрэннасьці"

У БССР нават школьнікі ведаюць, што гэта чыстай вады прапаганда, без рэальнага нацыянальнага зьместу, каторую неафіцыйна пачаў сам Гарбачоў, каб дзеля рэклямы і большай важнасьці заступіць у назове Савецкага Саюзу (СССР) слова "Савецкіх" словам "Сувэрэнных" рэспублік.

Цікава, але зразумела, што ў тым самым часе, калі на ўвесь сьвет трубіцца аб "сувэрэннасьці" (маем на ўвазе гарбачоўскую "сувэрэннасьць"), праўдзівая сувэрэннасьць адмаўляецца тым-жа самым Гарбачовым, скажам, прыбалтыкам, якія дамагаюцца яе ад некалькіх гадоў.

Савецкая тэорыя і практыка вельмі далёкая ад сябе. Агульна вядома, што рэальная ўлада у СССР спачывае ня ў руках урадаў паасобных рэспублікаў, ці нават у руках ураду СССР. Яна знаходзіцца толькі і выключна ў руках камуністычнай партыі, апанаванай расейцамі. Гэта было выразна падчыркнена самім Сталінам пры тварэньні БССР у 1918 годзе, калі беларусы наіўна дамагаліся незалежнай ад Масквы беларускай камуністычнай партыі.

БССР у рэчаіснасьці была перад праклямаваньнем г. зв. "сувэрэннасьці" ў практычным сэнсе дзяржаўнай фікцыяй, такой-жа фікцыяй, яна засталася і пасьля праклямаваньня "сувэрэннасьці". Доказ гэтаму: "Адкрыты ліст Цэнтральнаму Камітэту Кампартыі Беларусі", у якім беларускія пісьменьнікі, сябры партыі, пытаюць: "Каму, якому народу служым?.." ("Літаратура і мастацтва" ад 5 кастрычніка 1990 г.).

Наўрад, ці нешта зьменіць гэты "Адкрыты ліст", а тым болей наіўная прамова на Сустрэчы кангрэсманкі Мэры Роўз Оўкэр, ані тытул шэфа місіі БССР пры Аб'яднаных Нацыях, ані зацемка ў самой рэзалюцыі. Назоў крыху іншы, але зьмест той самы — расейскі.

4. Няма ў рэзалюцыі нават успаміну аб Акце 25 Сакавіка, які зьяўляецца галоўнаю прычынаю існаваньня беларускай палітычнай эміграцыі пасьля Другое сусьветнае вайны, у гэтым ліку існаваньня да гэтага часу і арганізацыяў, адказных за тэкст рэзалюцыі. Бачна, што для арганізатараў зьезду Акт 25 сакавіка перастаў існаваць.

5. Не ўспамінаецца ў рэзалюцыі аб дамоўленасьці Масквы (падчыркваем — Масквы, ня Менску) з Ватыканам, адчыняючай шлях да палянізацыі беларускага каталіцкга насельніцтва, што ўжо пачалася праз вызначэньне польскага клеру: ад біскупа і ніжэй... Адным словам, пачалося тое самае сярод беларускіх католікоў, што робіцца расейскай праваслаўнай царквой сярод праваслаўных беларусаў БССР.

6. У працэсе ацэнкі важнасьці праблемаў аўтары рэзалюцыі сьведама аграничыліся пытаньнямі лёкальнай важнасьці, як напрыклад: "просьба да ўладаў Беларускай ССР, каб было спынена накладаньне мыта на дэзымэтры і г. д." , а абмінулі зусім пытаньне і праблемы, якія дэцыдуюць аб тым — быць, ці ня

быць Беларускай нацыі.

Трэба успомніць і дадатні параграф у рэзалюцыі — гэта, цытуем: "выказаньне непакою (не пратэсту) з прычыны нарастаньня антыбеларускай акцыі на Беласточчыне". Выглядае, што ў адносінах да палякоў аўтары рэзалюцыі выказалі пэўную дозу крытыцызму і адвагі. На падобнае асьветчаньне, у сваёй сутнасьці вельмі слабенькае, пад адрысам багацейшых ад Польшчы, — Рыму, Масквы ды сёньняшняга саюзьніка Масквы: Вашынгтону — аўтарам рэзалюцыі адвагі ўжо не хапіла.

Як бачым на аснове пададзеных вышэй заўвагаў і фактаў, рэзалюцыя зьяўляецца тыповым прыкладам палітычнаграмадзкага сэрвілізму ейных аўтараў у адносінах да сваіх багатых апякуноў. Гэта бязумоўна шкодная зьява. Пацяшаючым аднак ёсьць факт, што будучыня Беларусі ня будзе залежаць ад малой кучкі палітычных каньюктурыстаў, а будзе вырашана на Бацькаўшчыне Беларускім Народам. Працэс вырашэньня Беларускім народам гэтага найвышэйшага нацыянальнага пытаньня ўжо пачаўся.

Беларуская эміграцыя, незалежна ад рэлігіі і сацыяльных перакананьняў, павінна адыграць у гэтым працэсе сваю пасільную ролю, а ня блукаць па сьцежках-дарожках ідэялёгічнага бездарожжа.

Гэта яе нацыянальны абовязак. Да спаўненьня яго мы заклікаем.

М. Панёманскі

У абарону праўды

Уважаючы, што шмат сьведамых беларусаў на чужыне мелі нагоду запазнацца з кнігай, выданай у 1986 г. сп-вам Зорай і Вітаўтам Кіпель, пад назовам "Беларуская Дзяржаўнасьць".

Па сутнасьці ў кнізе зьмешчаны працы, напісаныя рознымі аўтарамі ў форме дакладаў, або гістарычных нарысаў з часу беларускага нацыянальнага руху. Вядомым ёсьць, што аўтары кнігі ў пэўных выпадках выбіралі паводля свайго ўпадабаньня важнейшыя факты, якія ўважалі, будуць поўнасьцю вычэрпанымі для чытача.

Кніга вельмі прыгожа выдана, ангельская мова "пэрфэкт". Гэта сьведчыць аб тым, што перакладчыкі шмат над гэтым папрацавалі. Бязумоўна, тут адчуваецца і прыхільны ўдзел прафэсара Тамаша Э. Бірд.

Сёньня, на вялікі жаль, ёсьць мала кніжак, ці іншых выданьняў па ангельску. Апошнім часам што раз больш атрымліваем лісты ад навукоўцаў, ці студэнтаў, зацікаўленых беларускай тэматыкай. Мажліва, на гэта спрычыніліся рознья выданьні, — прыязныя нам і варожыя.

Вяртаючыся да зьместу кнігі, на маю думку, праца Васіля Захаркі, якая знаходзіцца ў Беларускай Бібліятэцы ў Лёндане, ёсьць найбольш інфармацыйнай для гісторыка, які хацеў-бы запазнацца з пачаткавай гісторыі БНР, І-м Усебеларускім Кангрэсам, Актам 25-га Сакавіка 1918 г. і г. д.

Ня бачыўшы арыгіналу працы В. Захаркі, нельга мець праўдзівага уяўленьня пра тое, што пададзена ў кнізе пра падзеі таго часу, а што прапушчана. Ня хочацца верыць, каб В. Захарка абмінуў важнейшыя факты. Чужынец-дасьледчык згубіцца ў ваенных падзеях таго часу, асабліва пры зьменах улады ў Менску.

Трэба прызнаць часткава талерантнае становішча немцаў да беларусаў, бо падчас іхняе акупацыі Беларусі прайшла падрыхтоўчая праца да скліканьня І-га Усебеларускага Кангрэсу.

У кнізе прапушчаны пэўныя дэталі, як напрыклад:

1. Пасьля абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі ў шматлікіх краінах былі абаснаваныя Дыпляматычныя Місіі — прадстаўніцтвы. (пералік на 112 ст.) Цікава, чаму прапушчана консульства ў Турцыю, у той час, калі маюцца на гэта дакуманты. Мажліва таму, што консулам быў др. Ермачэнка?

2. Што сталася з Урадама БНР пасьля выязду ў Бэрлін? Для чытача гэта ёсьць вельмі важны пункт.

3. Якім чынам В. Захарка 1-га жніўня 1920 году абвясьціў *другі раз* незалежнасьць Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі? Бо-ж ведама, што В. Захарка выяхаў з Урадам БНР у Бэрлін, пасьля жыў у Празе Чэскай, дзе і памёр. Ня толькі для чужынца, але і для нашага маладога пакаленьня трэба

было падаць больш фактаў.

Трэба прызнаць вялікую заслугу аўтарам пры укамплектаваньні аутабіяграфій некаторых ведамых беларускіх дзеячоў. Фактычна ліста гэтая мусіла-б оыць прынамсі падвойнай, або патройнай, бо няўспомненыя беларускія дзеячы, якія мелі ня меншы ўклад у палітычнае жыцьцё. Але на гэта аўтары заусёды маюць свой погляд. У агульным пажадана было-б, каб працы, пісаныя на гістарычныя тэмы, адпавядалі рэчаіснасьці, а характэрыстыка "гераяў" была сапраўднай, без ніякага палітычнага нахілу.

Фактычна "Беларуская Дзяржаўнасьць" прысьвечана гісторыі БНР і яе тварцом. Пра пасьля БНР-аўскі беларускі нацыянальны рух не ўспамінаецца, як-бы ён і не існаваў. Адказ на гэта можа быць просты: гэта другая тэма. Поўнасьцю пагаджаюся з аўтарамі. Калі-ж так, дык навошта ўваходзіць у зласьлівую палеміку пры апісаньні аўтабіяграфій некаторых дзеячоў?

Для прыкладу возьмем некаторыя ўрыўкі з кнігі.

Вацлаў Іваноўскі: ...назначаны немцамі ў 1941 г. на розныя важныя адміністрацыйныя становішчы. Апошняя ўплывовая пазыцыя была ў чыне бургомістра гораду Менску...

Канстанцін Езавітаў: ...прымаў актыўны ўдзел у беларускім палітычным жыцьці падчас II-е Сусьветнае Вайны. Быў назначаны Галоўнакамандуючым Беларускіх Збройных Сілаў у 1944-45.

Айцец Вінцук Гаплеўскі: верыў, што немцы дадуць беларусам прынамсі шырокую аўтаномію... Ён быў даверанай асобай у немцаў.

Др. Іван Ермачэнка: арганізаваў першую Беларускую Місію і Кансулят у Турцыі ад БНР... Падчас II-е Сусьветнае Вайны супрацоўнічаў з немцамі... "Муж Даверу" ,,,

Францішак Кушаль: Сядзеў у турме з гэн. Андарсам у Маскве ў 1939 годзе. Цудам пазьбег лёсу Катыні. Падчас II-е Сусьветнае Вайны быў адным з першых арганізатараў і камандзерам Беларускіх Збройных Сілаў, якія пазьней былі ядром БК А.(Відаць, не супрацоўнік, хоць чужую насіў уніформу?).

Радаслаў Астроўскі: У пачатку савецка — нямецкай вайны ў 1941 г. быў нямецкім КАЛЯБАРАНТАМ... Быў назначаны Прэзыдэнтам Беларускай Цэнтральнай Рады пры нямецкай акупацыі. У сваім жыцьці быў заангажаваны ў шматлікіх нявыразных і непапулярных прадпрыемствах.

Для ўвагі чытычам я падаў некалькі ўрыўкаў з біяграфій нашых заслужаных дзеячоў падчас ліхалецьця Савецка-Нямецкай вайны.

Сп-ва Кіпелі ў 5-ці выпадках ужываюць розную тэрміналёгію: супрацоўнік, назначаны, даверaная асоба, "Муж Даверу".. Што-ж датычыцца асобы Р. Астроускаг , дык ён вышаў адзіным КАЛЯБАРАНТАМ з усіх пералічаных Кіпелямі супрацоўнікаў з немцамі. Відаць сп-ва Кіпелі ўзялі цытату з пашквільнае кнігі Лофтуса. Ці-ж гэта не тэндэнцыя?

У імя праўды я рашыў выступіць у абарону ўсіх беларускіх дзеячаў, якія аддавалі сваё жыцьцё ў абарону зруйнаванага вайной краю. Застаецца запытацца у чытачоў гэтага артыкулу наступнае: ці змушаныя абставінамі часу беларусы мусілі браць, або ня браць удзел у супрацы з акупантам? Адказ можа быць толькі адзін — так, мусілі! Калі-б тагачасны беларускі актыў адмовіўся ад супрацы з немцамі, дык у Менску арудаваў-бы нейкі маскоўскі Власов з салідарыстамі. Яны зьнішчылі-б больш беларусаў, чым немцы, і ў дадатку не дапусьцілі-б ніякае беларускае культурнае і асьветнае працы і г. д. Беларусы ішлі і мусілі ісьці на супрацу, каб бараніць ад вынішчэньня Беларускага народу, ягоны актыў, ягоныя сьвятыні, ягоную культуру і г. д. Польскія і расейскія агенты густа абселі нямецкія вайсковыя ўстановы ад адміністрацыі да "далмэчараў" СД на ўсёй Беларусі з адным заданьнем —нішчыць беларускі народ, а перад усім актыў. Сам Берут сядзеў у адміністрацыі Менску побач з салідарыстамі. Таму зразумела, што беларусы мусілі неяк супрацоўнічаць і не маглі аставацца з боку.

Ці мала было зроблена карыснага ў абарону Беларускага Народу? Тычыцца гэта Самапомачы, БЦР, СБМ, Культурных Таварыстваў і іншых.

Вельмі хутка "героі", жывучы ў цяпле захаду, забыліся пра тое, дзякуючы каму апынуліся яны на свабодзе?

Савецкая прэса вельмі шмат пісала і піша пра нашыя нацыянальныя дасягненьні падчас II-е Сусьветнае Вайны, бязумоўна, перакручваючы ўсё на Сталінскі капыл. Я быў пераконаны ў тым, што знойдуцца разумныя людзі на тэрыторыі савецкай імпэрыі, якія, адкінуўшы савецкую прапаганду, ўзбагацяць свае веды пра беларускі нацыянальны ўздым падчас ліхалецьця II-е Сусьветнае Вайны. Гэтак і сталася, бо я меў нагоду сустрэцца з такімі. Сёньняшнія падзеі ў Беларусі сьведчаць аб тым, што наш нацыянальны высілак ня быў змарнаваны.

Нічога дзіўнага, што немцы не лічыліся з беларусамі падчас І-е і ІІ-е Сусьветных Войнаў, бо мы самі ня ўмеем сябе шанаваць.

Сп. В. Кіпель меў талковы пагляд на аб'еднаньне беларускай эміграцыі. Прыкладам — супольныя 3-ы Фэстывалі. У праграмцы Фэстываляў, у нарысе аб гісторыі Беларусі пішацца: "Нямецкая акупацыя, падчас ІІ-е Сусьветнае Вайны прынесла часовы пэрыяд супакою, які даў магчымасьць беларусам спантанічна ажывіць нацыянальную сьведамасьць, супроць намераў нацыскай палітыкі для Ўсходняй Эўропы. У 1944 г. ў Менску быў скліканы ІІ-гі Ўсебеларускі Кангрэс, які падцьвердзіў нязломную волю Беларускага Народу да поўнай дзяржаўнай незалежнасьці." У апрацоўцы гэтае праграмкі прымаў удзел і сп. Кіпель.

В. Цярпіцкі

І на чужыне помніў Беларусь

Калісьці, а менавіта 3 красавіка 1982 г., я ўспомніў пра свайго сябра Лявона Случаніна. І, у выніку думак аб ім, у мяне зьявілася нібы эпіграма на яго:

Жыў на сьвеце мой сябра Лявон,
Што паэтам Случанінам зваўся.
Ня жыве, як паэт, болей ён,
Бо чэкістам у рукі аддаўся.

Што Лявон Случанін памёр як паэт, я думаў і раней,, і пазьней: ад часу, калі даведаўся, што з Нямеччыны, дзе ён быў у эміграцыі, Лявон Случанін вярнуўся на Бацькаўшчыну. Я быў амаль упэўнены, што як асоба, як чалавек Лявон жыве дзесьці ў лягеры, дзе ўмовы ня могуць спрыяць творчасьці. І, калі ў зборніку паэтаў-эмігрантаў "Ля чужых берагоў" у зацемцы перад падборкаю вершаў Лявона Случаніна гаварылася, што ён памёр, я не паверыў гэтаму.

Мая ўпэўненасьць, што Лявон Случанін не памёр, аднойчы пацьвердзілася: 6 лютага сёлета я атрымаў ліст з Бацькаўшчыны і моцна зьдзівіўся і ўзрадаваўся, бо ліст быў ад Лявона Шпакоўскага (Случаніна) з Салігорска. Як ён здабыў мой адрас, я не пытаўся ў яго.

З таго часу між намі зьявілася сяброўскае ліставаньне. Пішучы да яго, я, бязумоўна, запытаўся, ці ён яшчэ жыве як паэт, ці друкуецца дзе? І атрымаў адказ,, што яго яшчэ нідзе не друкуюць, і ён з горыччу працытаваў Ул. Маякоўскага: "Ну что ж, над своей страной я пройду стороной, как проходит косой дождь". З наступных яго лістоў я даведаўся,, што падборка ягоных вершаў ужо каля двух гадоў марнуецца ў рэдакцыі "Полымя". Але яшчэ да гэтага я зьвярнуўся да яго з пытаньнем, ці хацеў-бы ён, каб наш часапіс надрукаваў колькі ягоных твораў? Ён даў згоду і прыслаў 9 сваіх вершаў, якія мы надрукавалі ў мінулым (35-ым) нумары. А сёньня мы друкуем яшчэ 10 вершаў Лявона Случаніна.

І, нарэшце, мушу адзначыць, што лёд замоўчваньня Лявона Случаніна на Бацькаўшчыне лопнуў: пра яго і пра Тодара Лебяду загаварыў Барыс Сачанка ў артыкуле "Напісана пяром" у тыднёвіку "Літаратура і мастацтва" (№40, ад 5 кастрычніка 1990 г.).

Янка Золак

Лявон Случанін

СЭРЦА СЧАРНЕЛА З НУДЫ...

Сэрца счарнела з нуды.
Рана заінелі скроні.
Не лятуцець пра уздым
Дрэву бяз кроны.

Зьдзьмухнуў суздром хараство
З дрэва гарматны кашаль.

Сёньня аголены ствол
Точыць пакуты шашаль.

Нездавальненьне і злосьць
Грудзі мае спружыняць...
Трутам дыміць маладосьць
На зруйнаванай чужыне.

Гёкстэр, 22. 3. 45 г.

АГНІ

Прамільгнула палярнае лета.
Завалілася восень гніць.
А за ёю па тундры сьледам
Замігалі, як зоры, агні.

Толькі жаль, што агнём тваім
Тут мае ня любуюцца вочы.
А чаму-б, дарагая, дваім
Ня мігцець нам агнямі ўночы?

Калі-б нашы агні спалучыць
Вось пры гэтай шчасьлівай нагодзе,
Мы-б хадзілі з табой уначы,
Як другія пад сонцам ня ходзяць.

Дык ляці-ж да мяне хутчэй,
Супыні назаўсёды мучэньне.
Хай палас у цемры начэй
Нашых зыркіх агнёў спалучэньне!

Варкута, 1955 г.

ГАРАВАХА

Ёсьць на Случчыне мілы гай.
Там і ўночы бялеюць бярозы.
Там пявучаму птаству рай.
І касому ніякай пагрозы.

Там напачатку ваенных падзей,
Грозных, крывавых, нячыстых,
Цёплаю кроўю нявінных людзей
Дол залівалі фашысты.

Сустракаўся з тым гаем і я.
Сэрца цешыла кожная птаха...
Апраўдаў ты сваё імя,
Гора бачыўшы гай, — Гараваха.

Салігорск, 1983 г.

НЯ ЗБЫЛІСЯ ЮНАЦКІЯ МАРЫ

Ня збыліся юнацкія мары,
Напаткаў мяне час круты.
Напаткалі астрожныя нары
І шалёны буран Варкуты.

Напаткалі лясы Пашахоньня —
Сьведкі першай мае бяды.
Толькі шкода, што там сягоньня
Стыне мора гнілое вады.

Разам з лесам пілою лучковай
За астрожнага хлеба кусок
Зрэзаў я пад трайною аховай
Мар юнацкіх узьнёслы лясок.

Салігорск, 1986 г.

Я ЗЬБІРАЮ...

Я зьбіраю па кропельцы,
ойццам пчала,
Паэтычны нектар
з патрывожаных кветак.
Мне ня шкода ні сэрца,
ні сіл, ні чала,
Калі з ношаи лячу
і змагаюся з ветрам.
Колькі цёплых гадзін
я украў у начэй,
Снуючы над бязьмежным
паэзіі полем,
Ня спускаючы з кожнае
кветкі вачэй,
Сабіраючы сок,
перамешаны з болем.
Мне, напэўна,
ужо не сабраць
Некранутага болем
нектару:
Хіба можна забыць
рамантычную раць,
Ад рукі душагуба
прыняўшую кару?!

1962 г.

ЧОРНАЕ ЛІСЬЦЕ

Сёньня ў лесе Ласіным
Чорнае лісьце асіны,
Што шаргаціць пад нагамі,
Покуль ня ўкрыта сьнягамі,
Зьвярнула маю увагу.
Чаго не здаралася штосьці
У ветранай маладосьці.
Бяз жаднай увагі калісьці
Хадзіў я па чорным лісьці.
А зараз пытаньне паўстала:
Чаму яно чорным стала?
Чаму у бярозак,
што нікнуць пад слотай,
Дол залацістай
усланы лістотай?
Напэўна, пад неба дахам
Асіна жыла пад страхам
Ад прыткіх маланак і грому,
Што крону пашкодзілі
дубу старому,
І страшнейшай парою тою
Працялася ўся чарнатою,
Якую скідае з лістотай,
Агорнутая самотай,
Каб старацца самой сабою,
Зраўняцца з бярозкай рабою.

1989 г.

ЗВАРОТ ДА БОГА

Кажуць: ад радыяцыі
Належыць згінуць нацыі.
Нацыі беларусаў,
Зьведаўшых столькі прымусаў,
Столькі драпежнага зьдзеку
На гэтым праклятым веку.
Нас ня мінула Чарнобыля хмара.
Зашто нам такая кара?!
Няўжо захацелася Богу
Нам вымасьціць сьмерцю дарогу?
Чым-жа грэшныя мы перад Богам?
Можа тым, што к чужым прывыкаем дарогам,
Што цураемся нашай асновы:
Нашых песень і нашай мовы,
Нашых звычак і нашай гісторыі,
Нашай даўняй багіні Вікторыі,
Нашай спадчыны, нашага духу,
Прымнажаючы ў сэрцы скруху?
І канца няма гэтым "можа".
Не карай нас, магутны Божа!
Толькі Ты, прабываючы дзесьці,
Можаж гэту бяду адвесьці:
Не дасі захлынуцца нацыі
Ад чарнобыльскай радыяцыі!
Ну а мы, што другім дагаджалі вякамі,
Пачнем паволі спраўляцца з грахамі.

1990 г.

AVE АЙЧЫНА

П. Манькову.

Любіць цябе
твой далекі хлапчына
моцна і шчыра.
Ave Айчына!
Нават пад кулямі
гэты мужчына
выгукне сьмела:
Ave Айчына!
Так паступіў
не адзін малайчына,
вёўшы змаганьне.
Ave Айчына!
Люд твой зламалі
аўрал, штурмаўшчына,
сталінцаў зграя.
Ave Айчына!
Хочацца верыць:
міне чартаўшчына
і ты уваскрэсьнеш.
Ave Айчына!
Дзетак зьбярэш
да апошняга сына,
выгнаных з дому.
Ave Айчына!
Пойдзеш да шчасьця
рашуча і чынна,
ліха ня знаючы.
Ave Айчына!

17. 10. 90 г.

ЗЯМЛЯ ПРАЧНУЛСЯ

Янку Золаку

Зямля прачнулася.
Зазелянелі дрэвы.
Пад ласкай сонейка
Ільсьніцца рунь.
Укрыты травамі
І кветкамі угрэвы.
І птушкі з выраю
Вяртаюцца угрунь.
Вясна, вясна!
Хаця-б ты не апошняй
Была ў маім
Здрасаваным жыцьці,
Каб я і старасьці
Зьнясіленаю пожняй,
Ну, хоць бы вобмацкам,
А змог брысьці!

25. 4. 1990 г.

ВЁСКА

Янку Золаку

Семдзесят пяць гадоў
У сэрцы нашу я вёску,
Квецень яе садоў,
На прыгуменьні бярозку,
Жыўнасьць у гожым двары,
Дбайных сялян турботу,
Кут, дзе малы і стары
Знаходзяць сабе работу;
Красуючай нівы загон,
Лугоў сакавітыя травы,
Любві хрысьціянскай закон,
Добрасумленныя справы,
Душэўныя песьні жанок,
Духоўнасьці глебу — абрады,
На хвалях дзявочы вянок...
Мудрых дзядоў парады...
Зьнікла амаль зусім
Вёска, што ў сэрцы маім!

Сакавік 1990 г.

ПРАЧНУЛАСЯ

Лявону Случаніну

Прачнулася мая Радзіма,
Ды ня зусім:
Яшчэ над ёю хмарных зімаў
Вісіць кілім.

Прачнуўся горад, вёска,
Страсае сон,
А па-над імі адгалоскам
Лунае звон.

І ўжо узьвіўся ў выс зорнай
Пагоні сьцяг,
Гучыць над людам непакорным
Кліч да жыцьця.

І дзеці роднае матулі:
Брат і сястра

Янка Золак

Паветра сьвежага каўтнулі,
Збываюць страх.

Уваскрашаюць маці мову
І жар крыві,
Ня хочуць больш схіляць галовы,
Душой крывіць.

А цэрберы былога ладу —
Стражы акоў —
Яшчэ драсуюць нашы грады
Ганьнёй ваўкоў.

Ды запаліў мой брат каханы
Агонь душы.
Ня дасьць ён колісь Край Забраны
Ізноў душыць!

1 сьнежня 1990 г.

ПАМЫЛКІ ДРУКУ Ў ВЕРШАХ Л. ШПАКОЎСКАГА - СЛУЧАНІНА

"(Беларуская Думка"" № 35 1990 г.)

НАДРУКАВАНА:	ПАТРЭБНА:
У вершы "ДУБОК"	
8-мы радок: зьнікаюць шапкі	зьнімаюць шапкі
У вершы "БЯСЬСЬМЕРТНІКІ"	
4-ты радок: лячыў душу	лячыў душы
11-ты радок: няхай душа	няхай душу
У вершы "ПОШУК"	
8-мы радок: я цягнуць	я цягаць
12-ты радок: немцы Варкутою	ненцы Варкутою
У вершы "ВІШНІ"	
13-ты радок: колькі срэранай	колькі срэбнай
15-ты радок: кропля расы	кропляй расы
18-ты радок: Разглуляцца	Разгуляцца
24-ты радок: любі мых вышань!	любімых вішань!
У вершы "ПАДАРЫ"	
3-ці радок: перапоўненай бядзе,	перапонай бядзе,
У вершы "ПОМНЮ"	
15-ты радок: бяздонныя гаці	зыбучыя гаці
У вершы "БАЦЬКАЎШЧЫНА"	
11-ты радок: сьлінявы агурок	сьлінявы акурак
12-ты радок: к Байдарскай губе,	к Байдарацкай губе,
36-ты радок: на паку радзіла.	на пакуту радзіла.
Памылка ў вершы М. Кавыля:	
"Беларусь, Беларусь".	"Беларусы, беларусы!"

П. Грыгальгык

ЖЫЦЬЦЁ

Мы стагодзьдзямі горкае мелі,
Вельмі цяжкае жыцьцё,
Што амаль зусім, вось, анямелі...
І гэта зараз не адкрыцьцё.

Хаця быў у нас і Каліноўскі,
І ня толькі ён быў адзін...
Але, вось, Урад у Менску — Больш Маскоўскі,
Больш за той, што ў Маскве сядзіць.

Ды ўсё-ж беларусамі стацца
Час нам сёньня надыйшоў.
Хоціць спаць, час абуджацца!
Лёд крануўся, з гулам пайшоў...

Трашчаць ланцугі ўжо, рвуцца,
З ног і рук лятуць кайданы...
Каб на тых кайданох не спаткнуцца, —
Ў нябыт сплаўляйце іх, Беларусі сыны!

***

Шчасьлівы той, хто з Хрыстом сябруе,
З Тым, Хто сэрцам, душамі кіруе
Як добра, што ёсьць Каму маліцца
І да Каго душою прытуліцца,

Апавядаць Яму, што нам баліць.
Ён адзін можа і цела абнавіць

І зразумець нас цалком, абсалютна.
Хрыстос над царамі Цар, магутны.

А таму ў нашым нешчасьлівым краі
Няхай народ да Бога уцякае,

Бо бяз Бога — вечная галеча.
Бо бяз Бога — д'ябал люд калечыць...

У гэты зьменаў векапомны час
Няхай Хрыстос пачуе грэшных нас.

І я разам зь іншымі Яму малюся:
"Божа, паглядзі на гора Беларусі!.."

***

Бачу дзеда майго бедака
З мазалямі на нагах і руках.

У калгас не загналі яго. У Сібір
Ён ня трапіў, як той закруціўся быў вір...

І галечу мой дзед перажыў,
И галаву на вайне не злажыў,

На былы свой вярнуўся загон:
Залыгалі ў калгасны прыгон...

Надрываўся, як мог... Быў хіцёр:
Уцёк у горад, а там... і памёр.

Ну, а зараз, каб жыў, дзіву даўся-б дзед:
"Глянь! — сказаў-бы — Перакуліўся сьвет..."

Так: перакуліўся, але ў лепшы бок
І Беларусь зрабіла сьмелы крок

І да мовы дзядоўскай, і да палёў...
Гэта нас лёс паклікаў і павёў...

Дык і пойдзем, каб Бацькаўшчыну адрадзіць:
Каб народ бяз прымусу шчасьліва мог жыць.

Ціхі Стаў

Янка ЗОЛАК

Аповесьць

(Працяг, пачатак гл. у №№ 33 - 35)

VIII

Прыехаўшы ў прызначаную ёй школу, Зося Барысевіч адразу-ж на другі дзень напісала Аляксею ліст.

"Паважаны Аляксей Паўлавіч! — пісала яна: — Як мы і дамаўляліся, пішу Вам першаю, каб падаць свой адрас ды паведаміць сёе-тое і пра школу.

Як я і прадбачыла, школа аказалася ў Горадзенскай вобласьці, але ня ў тым раёне, дзе я працавала машыністкаю, а ў суседнім, Горадзенскім і, сапраўды, зусім недалёка ад Літоўскае мяжы. Чаму мяне прызначылі ў школу іншага раёна ды яшчэ ў самы куток яго? Тут, мабыць, не абыйшлося бяз умяшаньня абкома камсамолу, які імкнецца ўкамлектаваць, у першую чаргу, школы раёна, які носіць імя іх вобласьці.

Вёска Ціхі Стаў і сапраўды, як Вы прадбачылі, знаходзіцца ў лясістай і балоцістай мясцовасьці. Сярод вялікага мяшанага лесу на калісьці, нашымі продкамі, высечанай паляне разьмясьцілася яна недалёка ад балота, Але гэтае балота, калісьці багністае, з шматлікімі "чортавымі вокнамі", з цягам часу падсохла, засьмецілася перагнілымі дрэвамі й лістотай ды патужэла. І ў некаторых месцах яно зрабілася даступным для здабычы торфу, а ў іншых — засталося багнаю з купінамі й люстэркамі вады. Сама-ж паляна, як гавораць мясцовыя жыхары, была расьцярэблена яшчэ ці не пры Ягайлу, а можа і раней, але ніхто дакладна пра гэта ня ведае. Толькі сярод мясцовых жыхароў жыве даўняя лягенда. Яе я раскажу Вам у адным з наступных лістоў.

І скажу Вам, што дастацца ў гэты Ціхі Стаў ня так лёгка, як я меркавала. Добра,

што я мусіла заехаць на месца мае папярэдняе працы, каб забраць свае рэчы і разьлічыцца з гаспадарамі кватэры. Гэта спрычынілася таму, што мой цягнік прыйшоў на патрэбны мне прыстанак у нядзелю раніцаю. Апынуўшыся з рэчамі на пероне, я зьвярнулася з пытаньнем да дыжурнага чыгуначніка:

— Як мне трапіць у Ціхі Стаў?

Ён, зірнуўшы на мае рэчы, адказаў:

— Каб папасьці ў Ціхі Стаў, Вам трэба схадзіць на рынак у мястэчка і там папытаць, ці ёсьць хто адтуль. Рынак тут недалёка. Але з багажом Вы туды ня зойдзеце. Пакіньце багаж у камеры перахоўваньня, а сама йдзеце на рынак. Вы яшчэ маеце час: раней першае гадзіны з рынку ніхто не ад'язджае.

Я паслухалася рады чыгуначніка. На рынку, які знаходзіўся за якіх два кварталы ад станцыі на цэнтральнай плошчы мястэчка, стаяла з дваццаць ці дваццаць пяць вазоў з задранымі ўгару аглоблямі. А на вазох, як звычайна на рынку, розныя сельскагаспадарчыя прадукты. Добра, што ў рыначным тлуме і гармідары мне параўнаўча лёгка ўдалося знайсьці хурманку з патрэбнай мне вёскі. Праўда, не з самой вёскі, а з суседняга хутара. Але хурман прывёз мяне да самай школы, якая стаяла трохі на водшыбе ад вёскі.

Гэта была звычайная хата заможнага селяніна, так званая пяцісьценка. Складалася яна з двух прасторных пакояў, кожны з якіх меў па чатыры вакны. Два вакны кожнага пакою глядзелі на дарогу, што вяла з мястэчка ў вёску Ціхі Стаў. На гэтую-ж дарогу глядзеў і невялікі ганак з трымя сходкамі. Над ганкам на двух слупах трымалася стрэшка, другі канец якое ўпіраўся ў страху хаты. Страха хаты і ганку была пакрыта гонтаю. З тыльнай сьцяны хаты-школы была прыбудоўка, якая раней, мабыць, зьяўлялася кладоўкаю ці клецьцю. Толькі ў ёй цяпер былі прарублены два вакны, трохі меншыя, чым у школе. Гэтая прыбудоўка мела асобны ўваход-ганак. У ёй кватаравала прыбіральшчыца школы, самотная ўдава Аксіньня. Акрамя сялянскай печы і стала, у кватэры былі два ложкі: адзін для Аксіянні, а другі прызначаўся для настаўніцы, адгарожаны ад рэшты пакоя крамнаю каляроваю заслонаю.

Сустрэла мяне Аксіньня, кабета гадоў трыццаці пяці ці сарака. Яна адразу-ж выйшла на сустрач, як пачула, што да школы хтосьці прыехаў. Памагла хурману занесьці ў кватэру мае рэчы.

Як толькі хурман ад'ехаў, Аксіньня спытала, колькі ён узяў з мяне за дарогу. І калі я сказала, яна выгукнала:

— Жываглот! Сумленьня няма ў чалавека. Двайную плату ўзяў!

— Нічога ня зробіш, — адказала я ёй. — Даганяць і адбіраць назад ня будзем.

— А Вас хацеў бачыць адзін малады прыстойны чалавек, — паведаміла яшчэ Аксіньня. — Абяцаўся наведацца яшчэ сёньня.

Я не распытвала ў яе, хто такі. "Калі абяцаўся прыйсьці, дык прыдзе і пабачу" — падумала я і пачала распакоўваць рэчы.

Аксіньня ў гэты час, ня пытаючыся, ці я галодная, ці пад'еўшы, пачала рыхтаваць пачастунак. Схадзіла, як я потым даведалася, у пограб, прынесла кавалачак сала, колца каўбасы і паўтузіна яек. Дастала аднекуль з запечка дробна наколаных дрэўцаў, распаліла на прыпечку агонь і паставіла на трыножку скавараду з падрыхтаванаю яечняй.

Не пасьпела яшчэ Аксіяньня паставіць яечню на стол, як у хату да нас ускочыў, нібы метэор, прыстойна ўбраны стройны хлапчына.

— Мір вам, я йзноў к вам! — прывітаўся ён з Аксіньняй. — Добры дзень, Соф'я Пятроўна! — зьвярнуўся ён да мяне.

"Ого, які прыткі, — мільгнула ў мяне думка: — нават ведае маё імя і пабацьку".

— Добры дзень, — адказала я, — Адкуль Вы ведаяце маё імя й пабацьку?

— Прабачце, я забыў адрэкамендавацца, — спахапіўся ён. — Я сакратар ціхастаўскае камсамольскае арганізацыі Юрка Шпак. А ведаю Вашае імя, пабацьку і прозьвішча таму, што ў райкоме мне сказалі, хто прызначаны ў нашу школу, і што Вы камсамолка. І я прышоў сказаць, што Вы ўжо ўзяты на ўлік у нашай арганізацыі.

— О, у такім выпадку, пахваляю Вашу аператыўнасьць і спадзяюся, што з Вамі будзе лёгка працаваць, — і падала яму руку.

— Ну, то сядайце падсілкуйцеся пасьля знаёмства, — запрасіла Аксіньня за стол.

— Дзякую, цётка Аксіньня, я не галодны. Але, каб настаўніца не падумала, што я грэбую ейнай кампаніяй, прысяду й я, — сказаў Юрка.

Скончыўшы падсілкоўвацца, я папрасіла Юрку, каб ён прайшоўся са мною па вёсцы, бо мне хацелася пабачыць, як яна выглядае. А Вам пра вёску я раскажу ў наступным лісьце.

Як бачыце, не пасьпела я яшчэ распачаць працу ў школе, як сама папала пад апеку камсамольцаў.

На гэтым дазволю сабе скончыць ліст і

пажадаць Вам усяго найлепшага. Бывайце здаровы! Чакаю ліста ад Вас.

Ведамая Вам Зося Б."

IX

Пішучы Аляксею ліст, Зося не напісала яму пра ўсё, што адбылося з ёю ў першы дзень побыту ў Ціхастаўскай школе і ў вёсцы Ціхі Стаў, куды яна пайшла з камсоргам Юркам Шпаком.

А падзеі разгортваліся так:

Па дарозе ад школы да вёскі камсорг "бяручы быка за рогі", сказаў:

— Вам, як камсамолцы з немалым стажам, мушу адразу паведаміць ня зусім прыемную навіну. Навінаю гэта будзе для Вас, але не для мяне і не для тутэйшых камсамольцаў. Не хачу Вас пужаць, але сказаць аб гэтым — мой абавязак. Вы, бязумоўна, чулі, што ў Беларусі пасьля вайны засталася нейкая нацдэмаўская арганізацыя пад назваю Чорныя Каты. Дык вось, група ці групка гэтых "катоў" дзейнічае і ў нас. За імі палюе даволі буйны аддзел органаў бясьпекі. Дык будзьце асабліва пільнымі і асьцярожнымі, бо да Вас могуць зьвяртацца і адны і другія. Не пападзецеся на вудачку "катоў".

— Што каты часам ловяць рыбу, хапаючы яе ротам ці лапамі, я чула, але ня ведала, што для гэтага яны ўжываюць і вудачкі, — пажартавала Зося.

— Што Вы ўмееце жартаваць, — засьяяўся Юрка: — гэта добра. Але не забывайцеся і на пільнасьць!

У такой: то сур'ёзнай, то жартаўлівай, з ноткамі трывогі ў голасе, Зося прайшла з Юркам невялікі адрэзак дарогі ад школы да вёскі.

А уваходзячы у вёску, яны зауважылі ідучага насустрач ім мужчыну.

— А вось да нас ідзе сапраўдны Кот, — заўважыў Юрка.

— Што?! — затрывожылася Зося: — сапраўдны "кот"?

— Так, сапраўдны Кот, брыгадзір тутэйшага калгаса "Прымежны" таварыш Котаў, — супакоіў яе камсорг. — Але ўсе ў нас завуць яго скарочана: Кот. Яго дзьве дачкі будуць у Вас вучыцца.

І зьвяртаючыся да брыгадзіра, які амаль падыйшоў ужо да іх, камсорг запытаўся:

— Куды Вы, дзядзька Кот, накіраваліся? Пазнаёмцеся з нашай новай настаўніцай. Гэта Зося Пятроўна Барысевіч, — адрапартаваў Юрка.

— А-а-а! — працягнуў брыгадзір. — Прыехала ўжо настаўніца... Мяне завуць Рыгор Котаў, — прамовіў ён, падаючы настаўніцы руку. — Я брыгадзір калгаса. Прыемна пазнаёміцца з маладою настаўніцаю. — А зьвяртаючыся да камсогра: — Іду ў поле паглядзець, якую дзялянку бульбы даць заўтра бабам выбіраць.

Разьвітаўся і пайшоў сваею дарогаю.

Разьвітаўшыся з брыгадзірам, Зося зьвярнула ўважлівы позірк на вёску. Яна ўбачыла звычайныя хаты, якія стаялі паабапал шыракаватае, але трохі скрыўленае вуліцы. Перад кожнаю хатаю відзён быў гародчык з краскамі й градкамі, адгароджаны ад вуліцы плотам. А перад платамі з абодвух бакоў вуліцы былі выкапаны няшырокія — як пераступіць — ірвы. Над ірвамі, перад варотамі кожнага двара былі перакінутыя масткі без парэнчаў.

Цяпер ірвы былі яшчэ сухія, без вады, бо апошні дождж прайшоў тыдняў два таму. Але кожную вясну і кожную восень ірвы бываюць паўнюткімі вады. А вуліца вёскі ў такі час — поўная гразі, у якую нага чалавека ўгрузае вышэй костачак. І лодачак дзяўчаты ў такі час ня носяць, баяцца пагубляць іх у гразі.

Аб усім гэтым Зосі расказаў камсорг. Але гэта ня было для яе навінаю, бо калісьці, калі яна была яшчэ малою, і іхняя вёска мела тую-ж бяду: гразь і ірвы.

— І Вам, Зося Пятроўна, трэба будзе... — ён зірнуў на Зосіны лодачкі, — або мяняць іх на чобаты, або, як і нашы дзяўчаты, хадзіць у такі час у лапціках лазовых.

— О Божа! — выгукнула Зося: — Няўжо мне давядзецца вярнуцца ў сваё дзяцінства? — і разрагаталася.

Вёска была невялікая, дваро ў 60. Амаль пасярод вёскі быў перавулак, які перасякаў вуліцу, абодвымі канцамі выходзячы за сядзібныя ўчасткі вёскі. У кожнай частцы гэтага перавулка былі пракопаны канавы. Яны адводзілі ваду з ірвоў кудысьці на луг, ці на балота.

Каля перавулка, які цягнуўся ўправа, знаходзіўся будынак, які нагадваў звычайную сялянскую хату, толькі большых памераў, і пакрыты быў не саломаю, а гонтам.

— Вось наш сельсавет, — паказваючы на гэты будынак, паведаміў Юрка. — Толькі сёньня ў ім нікога няма. Заўтра мы з Вамі зойдзем у сельсавет і залагодзім усе школьныя справы.

(Працяг будзе)

Антаніна Хатэнка

Зьдзічэлае рэха вясны

... А мая-ж ты кветанька,
А мая-ж ты любая,
У чырвона летанька
Ой, цябе на згубу я
Нарадзіла-песьціла
Люлянькаю-песьняю
Ножанькі здарожаны,
Ручанькі зьняможаны...

***

... Адплывае белая пасьцеля.
Бела дзеўка ручнікі пасьцеле.
Дакранецца лёгкім веем Жыва
Да зямлі збалелай літасьціва.
А на лузе зацьвітае лотаць.
Расьцілае дзеўчына палотны.
І струменяць сьветлыя сьцяжыны
З рук сьвятое жыватворнай Жывы.

***

... Ці прыйдзе да нашага краю
счарнелага
Вясна, як прыходзяць хвалі да берага?
Каторы гадочак бусловымі крыламі
Б'ецца надзея над чорнай магілаю...
Між Небам і Процьмаю хісткаю
кладкаю
Ляжыць Беларусь... Не дакорам —
адплатаю
І нават ня жорсткімі стогнам-
праклёнамі,
Ня ўсходамі жыта атрутна-зялёнымі,
Ня жалем Айчына мая задыхаецца...
Ей мроіцца Воля і Песьня-вясьняніца.

***

Над самы вільчак заляталі і ценькалі
Сініцы, жытло апяваючы, некалі.
Цяплеў журавель над спрадвечнаю студняю
Упарта і мудра. Бо мы-ж — ня прыблудныя.
У гэтай зямлі — карані нашы чэпкія,
І продкавы душы жывуць над палеткамі
Ды льлецца паветра зьмярцьвелае, склепнае —
Шчыруюць шыкоўна, ідэяй асьлеплены,
Над намі, жывымі, дасьледчыкі рупныя,
Вяскрылыя, з доляй бяздушна-атрутнаю
Чуж-чужаніцы з прарочымі вуснамі,
Жыцьця абаронцы з паглядамі вузкімі.

***

Ножанькі здарожаны.
Ручанькі зьняможаны...
А мая дачушачка,
Пташка-шчабятушачка,
Ягадка нясьпелая,
Галованька белая
А мая ты красачка,
Зорка мая ясачка.
Не згасайце, вочанькі,
Проціў цёмнай ночанькі...

***

У росах студзёных купаецца ночка.
Зязюля кувае ў самотным гаёчку.
Ня сьпіць белатвары анёл — немаўлятка.
Яму — гэтаксама над прорваю кладка.
Раскінуты роспачна ў сьвет ручаняты —
Расхрыстаны крыж — Акрылёны? Расьпяты?
Рашчэплены атам... Шчаплёныя пальцы.
І сьвечка ўтраплёная ў чорным палацы.
... У цёмным Сусьвеце устане Дзянніца.
Чарпну сьвятлыні даланёю з крыніцы.
Укленчу. І скажа сьвятая вадзіца,
Ці суджана сыну майму нарадзіцца...

***

Зьнямелыя вёскі, густыя прарэхі.
У шыбіны б'ецца зьдзічэлае рэха.
Апалены лёс, як маланкай арэхі.
... А песьня гняздуе пад новыя стрэхі.
А, можа, замова ў бездань ня кане?
Трапечацца ў небе, над ціхай пакорай,
Вясны і збавеньня вястун — жаваронак.
Дзяўчаты выходзяць з дзяржаўнага зьмроку —
Агонь ачышчальны паліць на пагорку.
Цямрэча зімовая нікне, згасае.
Вянок веснавы узыходзіць над краем.
Плывуць карагоды. Гайдаюцца хвалі.
Адпелі учора дзяўчо... Пахавалі.

***

... Не згасайце, вочанькі,
Проці цёмнай ночанькі —
Лёгкія пялёстачкі,
Сонечныя зайчыкі
На русавых костачках.

Донечка-сьлязіначка,
Яблынька ружовая...
Не аддам сьцябліначку
У глухія сховы я.

***

Хусьцінку сьціскаюць далоні нямыя.
Над белаи зямлёй — Чорны Дух лейкеміі.
Ляцяць Саракі. Сорак выраяў птушак.
Над краем, дзе зьвеку сяліліся душы...
На сорак дзянькоу малітоўна і скрушна
Заплакаць — матулі. А ветру загушкаць
Яе галашэньне ў нямых цянётах,
Дзе нам памяраці дазволена ўпотай.
Пад зоркай Бяды, на глухім небакраі
Чыя памінальная сьвечка згасае?

***

... "Ня я б'ю. Вярба б'е. Праз тыдзень — вялікдзень.
А, можа, і праўда ўваскрашэньне прыйдзе?
Сьвяточнай вярбінкай дзятва гаманкая
Вялікае Сонца вясны уздымае.
Устань, вялікоднае Шчодра-Сьвяціла,
Над краем панурым, над крыжам пахілым.
Над шэрай чарнобыльскай цёплай магілай,
Над цьвёрдай уладай, што сорам згубіла.
Жыву. Апантаных ідэйнікаў донар.
Чарсьцьвее зямля пад падэшваю чорнай.
Над чэравам хіжай палескай пачвары —
нявінных пакутнікаў боскія твары.
Над ветразем белай юначае мары
ашчэрана здрадай цяжарная хмара.

— Дожджык, дожджык, крапані,
бабу з поля прагані...
Гуляе са сьмерцьцю вясёла малеча.
Гульня-забаўлянка малечу калечыць.
Бо сонечны дожджык нясе нам ня вечнасьць.
Дажынкі сьляпыя усходы калечаць.
— Дожджык, дожджык, перастань,
мы паедзем на растань...

Адплакала ў полі тужлівая каня.
Бабуля зямлі сагрэбла на растаньне
У клуначак белы дрыготкай рукою.
А могілкі дыхалі сьцятым спакоем.
Ручнік на крыжы, як абраз перад сьветам.
З радзімы жанчына сыходзіць разьдзетай.
Атрутная вопратка кінута долу.
Няма павяртаньня да крэўнага дому.
Зьбірайцеся, дзеткі. Далёка паедзем.
Каму мы патрэбны? Вялікім суседзям?
Старэйшым братам у замшэлай хаціне?
А дзе-ж нам стамлёныя душы пакінуць?

***

...Вялікая Пятніца. Чысты Чацьвер.
Ці верне прырода цяпло і давер?
Ці скажа, дзе нашая доля начуе,
чаму ні зямлі, ні Сварога ня чуе?

Пайду. Акунуся на досьвітку золкім
У чысту вадзіцу. З халоднай палонкі
Выходзьма, народзе, на вольную волю,
дабром засяваці бацькоўскае поле.

У чысты чацьвер і заганы, і сьмецьце
павынесьці з хаты, з падворка і клеці —
было для матулі адвечным законам.
І мне не забыцца пра гэта да скону.

І мне-б ручнікі вышываці на покуць.
Мяне-ж спажывецкі вучылі галёкаць.

У небе нахабна паўзе пустазельле.
Ці мы тут нашчадкі? Ці... проста аселі,
з чужое зямлі пералётнае семя,
бязроднае, блуднае, мёртвае племя?

Субота Вялікая. Бела кашулі
дванаццаць дзяўчат-чараўніц апранулі,
сахою сьвяточнай наўкола радзіны
вядуць баразну, каб усходы радзілі,
малітвай сьвяточнай адпрэчваюць ліха.
Трывожна ўздыхае зямля-парадзіха.

Калі Усяночная сьвечкі запаліць, —
агнём страпянецца балючая памяць.
Мая-ж ты зямелька, мая малітоўня,
калі салавейка свой голас прытоміць,
калі у бары ацішэе зязюля,
пакаюся горка. А хто мяне чус?

***

... Не аддам сьцябліначку
у глухія сховы я...
Родная расіначка,
кропелька вясновая.
Апрану маліначку
у вянку валошачкі,
твае, донька, вочачкі...

***

Хрыстос уваскрос. І званы абвясьцілі
Сусьветную праўду адзінаю сілай.
Ды сьмерцю хрышчоны Дняпро пачарнелы.
Над Веткаю звон, як напятыя нэрвы.

Вялікдзень. Цяплее зямное улоньне.
Надзея збудзілася ў хцівым палоне.
Распрастваюць крылы маркотныя гоні.
Бунтуе Ярыла сьвятую Пагоню.
У вуснах паганскай дружыны ускрэсла
Забытая мной валачобная песьня:
"Спадарыні рушнай,
сыночкам-малойцам —
Нязгаснага шчырага весьняга сонца.
Дачушкам-нявестам — на долю красёнцы.
Люботы, спагаднасьці мужу ды жонцы.

Вялікдзень. Вялікдзень. Нястомнае сонца.
Матулінай веры жывой валаконцы.
Магічная споведзь зямлі і нябёсаў.
Маё прасьвятленьне. Прамень майго лёсу.

Ня верыцца больш абяцанаму шчасьцю.
Пайду да радзіны сьвятой на прычасьце:
у храме баюся прыпасьці да крыжа.
... Хто й сёньня яшчэ маю Вербніцу
крышыць?

За дозы сьмяртэльныя ў гул
дэманстрацый
Якімі рублямі бяздушна заплацяць?

Шарэнгі сьляпыя да бездані крочаць.
Крывёй захліпаецца ўночы сыночак.
Крыжуе растаньне маўклівыя вокны.
У гулкім бары грыбнікам не галёкаць...
Разьвеяўся попел балючых выжарын,
Як сьвечкі, над краем гаротным Выжары.

... Зжаўцелае цела на жоўтым улоне.
Падбітымі птушкамі ўпалі далоні.
А хто-ж уратуе, суцешыць, заслоніць? —
Бязьлітасна трэбы зьбірае плутоній.

Мая-ж ты зямелька, сьляпая вязніца,
а я-ж над табою вярбінаю ніцай
страчала дзяньніцу, вяла Мілавіцу.
Бывала, што сіл не ставала хрысьціцца...
Стаіць на кладах адзінока капліца —
ня будзе каму за памерлых маліцца.
Кідаюся ў сьвет, як у лютую пельку,
выгнаньніца любай сьвятое зямелькі.

**
*

... У вянку валошачкі —
твае, донька, вочачкі.
А маё-ж ты сонейка,
нашто закацілася?
На зямельцы цёмненька
без цябе зрабілася.
Ой, зь якога полечка,
родная зязюлечка,
галасок твой тоненькі
мне чакаць адкулячка?..

**
*

На Радаўніцу спаконвечнае Веча:
дзядоўскія душы лятуць на сустрэчу.
Засланыя белым цнатлівым абрусам
магілы — радзімкі маёй Беларусі.
Пад крыжам высокім — сьвячоныя трэбы:
чырвоныя яйкі, акрайчыкі хлеба.
Плыве над магілай малітва сьвятая.
Бабуля мая да мяне прамаўляе:
"У чорнай рацэ
ані плыні, ні броду,
збуцьвелі шляхі
старажытнага роду.
Чырвоная кара
над гордым народам.
... Ці ўсё вам даруе
адрынуты продак?

Блакітам сплываюць Касьмічныя рэкі...
Суровая праўда — бабуліны лекі.
"Запрэжаны люд
у тупыя аглоблі
і цісьне хамут —
неадольны Чарнобыль.
Гаючую сілу
балота панішчыць,
пакуль маладое
распальваць агнішча.
Ня спралі вы дбайнага
лёсу кудзелю.
Дрыгвою ускормлены
выбраўся нелюдзь.
Ці ён чалавечаю
доляй надзеліць?
Ня горды народ —
паслухмяная чэледзь.
У храме агня
загасае агніца.
Ідзі курганам
раніцой пакланіцца.
Да неба ўздымі
Ацяжэлыя рукі.
Паслухай Сусьвету
таемныя гукі..."
адрынуты продак."

Бабуля ў празрыстым тумане растала.
Чаму пра сябе гэтак ведама мала?
У сьне страпянецца душа на дасьвецьці,

Ізноў аднадзёнкай мільгае па сьвеце.

**
*

А там, за чарнобыльскай здраднай мяжою
Няспынныя круцяцца дзедавы жорны:
Часінай Ярылавай ніва рунее,
Даплатамі труннымі вёска панее.
Дуда пастуховая жаліцца-плача.
А што перайначыш? А хто перайначыць?
Ідзём нямінучым чарнобыльскім шляхам.
На сэрцы-вугольлс пякучага жаху...
Ня лекуюць раньнія юр'явы росы
І лесам бяздумным — "вопросы", "вопросы"...
А дозы і тэрмін даведзены крайнія.
Давер крываточыць, хлусьнёю паранены.

Радзіма мая — прымусовая грэшніца,
прытулак даеш афіцэрам і бежанцам.
Бадзяемся мы, твас дзеці бяздомныя,
і вечна пасьцім. Бо ня можна скаромнае.
Бо нас выракаюць на волю за кратамі.
Дратамі калючымі песьня расьпятая.
Бусьліныя гнёзды астылі над хатамі.
... На дрот і на зоны нязьменна багаты мы.

**
*

... Галасок твой тоненькі
пачую адкулечка?
Паявіся, дочачка,
пташка адляцелая,
хоць у небе кропачкай,
зорачкай нясьмелаю...

**
*

Крычаць груганы над халоднай спажываю...
А ў школе ізноўку — пра долю шчасьлівую.
На вернасьць ідэям дзятва прысягае,
нібы і ня ў нас пачарнелі прагалы.
У сьвеце балесным ні пекла, ні раю.
І толькі ашчаднікі рупныя знаюць:
ніхто ад Чарнобылю не памірае,
нікога чарнобыльскі лёс не карае.
На целе спаганеным сьпеўнай Нароўлі —
Пакутнымі ранамі новабудоўлі.
Быльлём зарастае дарога на Хойнік.
Знаменьне. Растаньне. Мой боль незагойны.
Ці стрэне радзіма заплаканы ранак?..
Ці вызірне сонца з-за белых фіранак?..

З усьмешкай спагаднай ідзе адрачэнец:
лагоду-угоду наверсе ацэняць...
Ніхто за раба не ўладкуецца лепей:
аддана ярлык свайму брату начэпіць,
растопча расаду матулінай мовы —
Грасецца трасянка у зычнай прамове.
Гукаюць па танныя транты спэцкрамы.
Сваіх дэпутатаў гадуюць спэцкамы.
Жыве прыпяваючы пан адрачэнец.
Хай дурні галодныя партыю чэрняць.
Ды што яны маюць? Абуджаны гонар?
А ён- — з пэрспэктывай. Бо ён —
прыручоны.

**
*

Ой, пайду я ў сьвет. Не вярнуся.
За мной доля ўсёй Беларусі.
У далёкі сьвет — не ў капейку.
Гора горкае кіну ў пельку.
Як пушчу стралу па ўсім сьвеце:
Ясна лецейка хай прывеціць.
Сьцеражы, страла, ад маланкі
Маю вёсачку-паланянку.
... Завіла вянок на бярозе:
Не крапіце дол, горкі сьлёзы.
Абдыму ямчэй родну матку.
На зялёныя ды на сьвяткі
правяду куста зялянога,
дайце-ж мне віна маладога
Ой, пайду-зьбягу. Не вярнуся
Ды русалінай абярнуся.
А як жыцейка закрасуе,
роднай нівачцы прынясу я
ды жывой вады поўны прыгаршчы.
Чарнабог жыцьцё, ой, ня вынішчыць.
Я пайду-пайду па ўсім краі.
Красна дзеванька ускрасае.
Сукня белая падвянечная,
у вачах — блакіт неба вечнага.
Ой, ня прывід я. А русалка.
Па зямлі блукаць стала змалку.
А дзяўчатанькі, мае сёстры,
Не пажаць усіх сярпом гострым.
Узмахнула ноч цёмнай грывай.
У кароне зор выйшла Жыва.
Выйшла вольная, бяз прымусу,
пакланілася Беларусі.
Абудзіўся край гул-ракою.
Ой, гудзе вясна талакою.

**
*

... а мая-ж ты кветачка,
а мая-ж ты любая...

Міхась Кавыль

Із агню ды ў полымя

(Раман. Пачатак у 33-м нумары "Б. Д.")

Быліца шостая

Арына Максімаўна Раманава, загадчыца студэнцкага агульнажытку, па старой звычцы супрацоўніцы "Органаў", — Спраўкаў нікому пабочнаму пра сваіх падапечных не даваць. — не сказала праўду Язэпу Лабачу пра Клашу. На ніякі фронт Клаша яшчэ ня ехала, а спала моцна юнацкім сном на раскладушцы ў невялічкім пакойчыку.

Арына Максімаўна, убачыўшы Лабача, адразу яго пазнала і ўнутранна скаланулася, як сабака, натрапіўшы на заячы сьлед. Ведала яна добра студэнта Лабача, які калісь жыў у пакойчыку каля дзьвярэй, там, дзе жыве Клаўдзія Пятрова з студэнткай Верай Гранкінай. Ведала Арына Максімаўна і тое, што Лабача выгналі із Пэдінстытута і забаранілі жыць і паяўляцца ў Варонежы. А ён вазьмі ды зьявіся... "Чаго-б гэта?.. Ды яшчэ хацеў пабачыцца з курсанткай сакрэтнага вучылішча. Тут штосьці пахне падазронасьцю." І Арына, адправіўшы Язэпа Лабача, пакавыляла ў сваю "канцылярыю", як яна ганарова называла сваю невялічкую "камнатушку", дзе і днявала, і начавала, часам не адна... Пасьпяшала яна да тэлефону, каб пазваніць "куды трэба" пра зьяўленьне ў Варонежы "нарушыцеля паспартызацы"і а, можа, і ня толькі "нарушыцеля", а нямецкага лазутчыка... Ужо зьняла трубку, але павесіла назад: стукнула ў галаву думка "дапрасіць Клашу"... Тут супрацоўніца "Органаў" прашляпіла. Пазвані яна "куды трэба", магчыма, Язэп Лабач із Варонежа ня выяхаў у Давыдаўку, а загрымеў туды, адкуль цяжка вярнуцца. Арына Раманава адлічалася непастаянствам характару, нястрымнасьцю ва ўсіх адносінах, самалюбствам і нераўнадушнасьцю да маладых хлапцоў. Сама была грэшніца, але сужэнцу грахі не даравала. Калі даведалася, што яе сужэнец, асыпірант Пэдінстытуту Мікалай Мікалаявіч "круціцца" з студэнткай Сьветай Івановай,, жонкай начальніка Абласнога НКВД, ня доўга задумоўвалася над тым, званіць "куды трэба", ці не званіць... Начальнік ня доўга ламаў голаў, як скруціць голаў Мікалаю Мікалаевічу: ляжала ў яго ў стале "Рэцэнзія" на кнігу Мікалая Мікалаевіча Раманава "Статуя", дзе "крытык" зьвяртаў увагу "Органаў" на вокладку кнігі, дзе "таварыш Сталін выглядае неякім замухрышкам..." Хаця у гэтым віна была мастака, а ня аўтара, Мікалаи Мікалаевіч апынуўся за кратамі. Арына для прыклёпу ўсплакнула, калі прыйшлі забіраць сужэнца, насіла "перадачу", пакуль "здраднік" сядзеў пад бокам, а як загрымеў у Сібір, стала прыглядацца да студэнтаў маладзенькіх, бо і сама была яшчэ маладая, усяго трыццаць гадоў. Тады прыгледзялася і да Язэпа. Ведала яна, як жывуць студэнты: радыя хлеба акрайчыку, а таму аднойчы запрасіла Лабача да сябе "пагутарыць па душах"... На стале стаяла чацьвярцінка гарэлкі, на эляктрычнай печцы пяклася яечня. Смачна пахла ў пакойчыку загадчыцы, і сама яна не пашкадавала надушыцца "трайным адэкалёнам"...

Калі чацьвярцінка апаражнілася, у галовах завалодалі мазгамі алкагольныя чорцікі, Арына лягла на ложак і расхіліла ногі, прыкрыла шэрыя вочы нахварбованымі чорнымі павекамі... Язэп паглядзеў на распусьніцу, ціхенька вылез із-за століка і гэтак-жа ціхенька адставіў табурэтку, якой Арына падперла дзьверы, і... зматаўся із агульнажытку. Зматаўся на заўсёды: знайшоў сабе танны пакойчык недалёка ад "Камінтэрна".

Перажыць абразу Арыне дапамагло наведваньне начальніка, сужэнца Сьвятланкі. Наведваўся ён ня часта, але ніколі не ўцякаў так, як Язэп... Начальнік хутка "прыеўся" Арыне. Стала яна "абыходжваць" сваёй увагай другога начальніка — "фізрука" мэдыцынскага тэхнікуму — Алёшу Новіка. Тады, да вайны, Алёша не адмаўляўся ад "дабрыні" Арыны, але вайна пераблытала ўсё і ўсіх. Алёшу Новіка па партыйнай лініі назначылі начальнікам "мэдыцынскіх курсаў". Пад шыльдай гэтых "мэдыцынскіх курсаў" хавалася школа дывэрсантаў, куды трапіла і Клаша Пятрова. Алёша ад першага спатканьня з Клашай "узяў яе на прыцэл". Арына хутка здагадалася, дзе "сабака закапаная": абнюхаў Алёшка сабе маладзейшую і прыгажэйшую "сучку". Іначай пра сябе Арына Клашу не называла. І, перадумаўшы званіць "куды трэба" пра Язэпа Лабача, рашыла дапрасіць

"сучку" і тады пазваніць "сабаку" Іванову пра "нарушыцеля паспартызацыі", пра "ненадзейнасьць курсанткі Пятровай" ды і пра "сувязь начальніка спэцшколы Аляксея Рыгоравіча Новіка з ненадзейнай Клаўдзіяй Пятроўнай Пятровай".

Клаша спала ў пакойчыку, што знаходзіўся каля самых дзьвярэй. Спала моцным сном, якім могуць спаць толькі маладыя стварэньні. У сьне лятала ажно пад самыя хмары, якія былі чамусьці якіясь чырвоныя. Можа таму, што лятала яна і ня ў сьне, а ляцела ўніз галавою праз рашчыненыя дзьверы самалёта. Ляцела ні жывая, ні мёртвая аж пакуль не рашчыніўся парашут і яе падкінула... То быў Клашы першы скачок і палёт. Баялася яна скакаць, думала адмовіцца, але ня ўсьпела вымавіць слова, як рука інструктара піхнула яе ў дзьверы. А прызямліўшыся, не магла нарадавацца, што ўсе страхі засталіся там, у самалёце, толькі саромелася спатыкацца з інструктарам. А ён сам спаткаў яе і сказаў, як-бы заглянуўшы ў яе душу: "Не прайміайцеся, таварыш Пятрова. Першы раз усе ў штаны напускаюць..." Абразілася Клаша за "ў штаны напускаюць" і адрэзала: "А я ў штаны не напусьціла... Можаце праверыць..." Зарагатала і пабегла ў агульнажытак.

І, вось, спала і лятала. Прызямлілася ў сьне ад моцнага груку ў дзьверы. Усхапілася, паглядзела на сяброўку Верачку, што мясьцілася на раскладушцы, прахапілася і тая. Памкнулася Клаша бегчы адчыняць дзьверы, але грукат спыніўся, дзьверы рашчыніліся і пачуўся хрыплаваты голас Арыны Максімаўны: "Клаўдзія Пятрова, на адной назе ў канцылярыю!.." Дьверы хлопнулі, Клаша адно здрыгнулася, як перад скачком із самалёта. І да Верачкі: "Што-б гэта магло здарыцца? Здаецца, я ні ў чым не правінілася..."

Верачка Гранкіна, старэйшая за Клашу гадоў на тры і прыгожая, як і Клаша, дзяўчына, здагадвалася крыху, "што-б гэта магло здарыцца". Жыла яна ў агульнажытку другі год і ведала, якая "цаца" загадчыца агульнажытку. Ведала, што Арына Максімаўна мела "шуры-муры" з Алёшам Новікам, а той здрадзіў ёй, бо закахаўся ў маладзенькую курсантачку Клашу. А што ён закахаўся, ўвесь дзявочы батальён толькі пра гэта і балабоніў. Верачка, як і ўсе балаболкі, была-б ня супраць, каб начальнік Алёша, як яго ўсе клікалі, звярнуў на яе ўвагу, але на Клашу ня гневалася за тое, што яна сталася выбраньніцай Алёшы, ды ўсе-ж... Ды ўсё-ж зайздрасьць падштурхнула яе пусьціць паміж Клашай і Алёшам чорную кошку, і Верачка прамовіла: "Арына Максімаўна — любоўніца Алёшы. Май гэта на ўвазе і ідзі..." Клаша натапырыла свае "бухматыя чмялі" на Верачку, якая нацягвала на вочы шэрае адзіяла, і пырснула: "Алёша?.. Калі вы ўсе памяшаліся на Алёшы, дык не залічайце мяне ў сваю хэўру."

— Ну, вось, ты якая гарачая, Клаша, — стала апраўдвацца Верачка. — Я-ж хацела як найлепш: каб ты ведала, што казаць Арыне...

Клаша ня стала слухаць Верачку і зачыніла за сабой дзьверы. Неўзабаве яна сядзела ў прапахлым табачным дымам пакойчыку за невялічкім столікам насупраць загадчыцы. Арына,, "мать солдатская", як яе завочна называлі дзяўчата, нэрвова зацягвалася дымам папяросы, абмацвала час ад часу Клашу касымі паглядамі, быццам абдумоўвала, за што яе ўкусіць, маўчала. Клаша таксама маўчала, чакала пытаньняў, а пасьля ня вытрымала і запытала: "Для чаго вы, таварыш Раманава, мяне выклікалі? Калі што паважнае хочаце спытаць, дык пытайце, бо я мушу зьбірацца на заняткі. Калі-ж наконт Алёшы,дык ён для мяне ноль бяз палачкі. Я маю нарачонага...

— Вось, я і выклікала цябе, каб пагутарыць наконт твайго нарачонага.

— А якая Вам справа да майго нарачонага?

— А такая справа, як твая справа да Алёшы...

Клаша пырхнула, памкнулася ісьці, але Раманава затрымала яе за руку, якая ляжала на стале, кажучы: "Не гарачыся, прыгажуня, паслухай старэйшых, можа, трошкі разумнейшых..."

Клаша паслухала і слухала, ня верачы сваім вушам:

— Твой нарачоны, Язэп Міхайлавіч Лабач, нядаўна быў тут, пытаўся пра цябе...

— А што Вы яму сказалі?..

— Сказала, што цябе тут няма, што ты паехала ваяваць...

Клаша ізноў ускочыла, гатовая ўзарвацца ад злосьці, і крыкнула:

— Вы, "мать солдатская", апошняя паскудніца...

Клаша не баялася абражаць Арыну Максімаўну, бо ведала ад Алёшы, што іхнюю "каманду" не сягоньня-заўтра адправяць у тыл ворага. Арына Максімаўна таксама ўскочыла

і, стукнуўшы кулаком па сталу, зашыпела:

— Ты не абражай мяне, саплівая, а станавіся на калені і дзякуй мне, што я адправіла твайго спакусіцеля з свастыкай запазухай!" Клаша акамянела, галава закружылася, яна ледзь утрымалася на нагах. Арына Максімаўна задаволена пазірала на пабялеўшую Клашу і рашыла дабавіць сваю, як яна думала, саперніцу: "Ты ведаеш, каго ты выбрала сваім нарачоным?"

— Ведаю... І ў Вас не папытаюся, каго мне выбіраць...

Арына Максімаўна, быццам, і ня чула Клашыных слоў, сьцябала Клашу скрыпучым голасам, надушаным сьмярдзючым тутунёвым дымам:

— А ты ведала, калі "выбірала", за што Лабача выгнала із Пэдінстытуту?

— Што Вы кажаце, Арына Максімаўна? — ужо лагадней ціха прамовіла Клаша.

— Тое, што ты чуеш... Выгналі яго і із Варонежа. Ён ня меў права прыяжджаць сюды на спатканьне з табою. Я як савецкі чалавек мусіла паведаміць у міліцыю, але не пазваніла, бо... Я ня ведаю, чаму не пазваніла...

— Бо Вы добрая, Арына Максімаўна...

І Клаша падбегла да Раманавай, пацалавала ў скронь і пабегла, выціраючы рукою вусны. У пакойчыку бухнулася на ложак, бухнулася так, што ажно іржавыя спружыны залемантавалі і перапалохалі Верачку.

— Ну, што?.. Угадала я, ці не?..

Клаша не адзывалася. Уся яна была ў такім стане, як перад першым скачком із самалёта. Яе калаціла не ад страху, а ад пачутага пра Язэпа Міхайлавіча. "Няўжо гэта праўда?" — сьвідравала мазгі пытаньне, але адказу ніхто ня мог даць. "Не, я яго мушу злавіць. Ён яшчэ ў Варонежы... Ён мне скажа ўсю праўду... Скажа." І Клаша ўсхапілася з ложка і пасьпешліва пакрочыла да дзьвярэй.

— Куды ты? — з трывогай у голасе запытала Верачка.

— Я зараз вярнуся...

***

Арына, "мать солдатская", Клашу "раскусіла": Клаша закаханая ў "ворага народу", Клашы ня мейсца ў школе дыверсантаў. Арына пазваніла, "каму трэба". Доўга на другім канцы ніхто ня браў слухаўку. Нарэшце раздобрыўся і, як выстраліў у трубку: "Слухаю"! У Арыны ажно слухаўка адскочыла ад вуха. "Слухаю" сказаў ня Ваня Іваноў, не начальнік НКВД, а яго "палавіна" Сьвятланка. Арына памкнулася павесіць трубку, але хутка перадумала: "Я праз яе можна сказаць угробіла свайго, няхай яна папсіхуе" — і ў трубку: "Я, Арына Максімаўна Раманава, хацела-б па-сакрэту пагутарыць з Ванем Іванавым..."

— З Ванем? — абурылася Сьвятлана. — Для ўсіх сваіх знаёмых ён Іван Іванавіч, а ля Вас "Ваня". Даўно ён такім стаў?..

— А ўжэ-ж не сягоньня...

— Цікава... Дзякую за вестачку, але "свидание" Вам назначыць не магу: Ваня ў адезьдзе...

Арына Максімаўна, атрымаўшы "ад варот паварот", не супакоілася. Не з такога яна была дзясятка, каб дазволіць ворагам савецкай улады гуляць на волі. Хаця яшчэ было ранавата грукаць у дзьверы начальніка "Мэдыцынскай школы" Алёшы Новіка, які жыў праз калідор, насупраць канцылярыі Раманавай, але справа была неадкладная, і Арына Максімаўна пастукала.

Клаша ў гэты час саскочыла з трамваю на прыпынку каля вакзалу і пабегла ў залю вакзалу, а там паспрабавала без чаргі пралезьці да касы. На яе закрычалі некалькі "хваставых" мужчынаў, каб стала ў чаргу. Клаша папрасіла прабачэньня, сказала, што яна не патрабуе білета, а хоча толькі запытаць у касіра, ці адыйшоў цягнік на Тамбоў. Тады яе прапусьцілі, і яна пачула: "Толькі што адыйшоў."

У роспачы накіравалася яна на пэрон, каб пераканацца ў пачутым, але дзьверы былі замкнутыя. Там, за дзьвярыма, пачулася грукаценьне колаў, скрыгат тармазоў, і Клаша ўбачыла праз шкляную верхнюю палову дзвярэй вайсковы эшалён. Калі эшалён затрымаўся, із вагонаў з кацялкамі ў руках сталі выскакваць маладыя чырвонаармейцы. Яны падбягалі да дзьвярэй, тузалі за скабу, а ўбачыўшы Клашу, крычалі: "Адчыні, красуня!.. Кіпяточку шкадуеш: зачынілася". Клаша памахала ім рукою і пайшла ў працілеглыя дзьверы, асуджаючы нерастаропнасьць жалезнадарожнага начальства, якое ня дбае пра абаронцаў Радзімы. Ня ведала Клаша, што бак з кіпенем знаходзіўся ў другім памешканьні. Чаго-чаго, а вады для абаронцаў Радзімы не шкадавалі.

З невясёлымі думкамі вярталася Клаша ў агульнажытак.

Злавалася ня так на Язэпа, як сама на сябе за "неабдуманы пасьпешлівы крок". "Ча-

го гэта мяне чэрці панесьлі із дому, як тую казу, што сарвалася з прывязі і пабегла ў капусту? Сядзела-б дома — прыйшоў-бы, нідзе-б ня дзеўся. А зараз лічы ўсё кончана. Шукай сабе, дурнёха, другога... Алёшку, Ваньку.Ды што іх шукаць? Самі знаходзяцца. Хоць-бы і гэты начальнік Алёшка. І стройны, і адукаваны, і ня дурны, кажуць, але-ж не Язэп... Баліць сэрца, хоць... хоць... А што, каб адпрасіцца на пару дзён і паехаць у Давыдаўку? Ён яшчэ, бадай, дома. Але, якую паважную прычыну прыдумаць, каб адпусьцілі? Сягоньня будзем ізноў скакаць з парашутам. Вось, каб парашут не раскрыўся..."

"Чацьвёрка" затрымалася ў рабочым пасёлку "Камінтэрну". Маладыя і старэйшыя пераважна жанчыны пайшлі да выйсьця. Клашка таксама зьлезла. Ідучы ў агульнажытак, думала тую самую думку: што рабіць? Але так і не прыдумала нічога, чаму-б начальнік паверыў і адпусьціў.

Верачка спаткала Клашу вылупленымі блакітнымі вачыма і дрыготкім голасам: — Што з табою творыцца, Клаша? Ізноў прыходзіла "мать солдатская"... Да начальніка мусіш "на адной назе"...

— Якая яна "мать салдатская"? Сьценькі Разіна яна "мать"... Нікуды я не пайду. Пайшлі яны ўсе к чортавай мацяры! Паеду дадому, і няха яны мне пацалуюць...

Верачка разьвяла рукамі, села за столік дапіваць гарбату, а Клаша выцягнула із пад раскладушкі чамаданчык і стала кідаць туды свае дзявочыя "прычындалы". Верачка памкнулася сказаць: "Ня псіхуй, Клаша", але затуліла вусны, бо ў дзьверы пастукалі. Клаша не зьвярнула на стук увагі, нэрвова зачыняла чамаданчык. Дзьверы адчыніла Верачка.

"Калі Магамет ня йдзе да гары, гара ідзе да Магамета". — З усьмешкай прадэкламаваў Алёша стары, як той Магамет, выраз і, убачыўшы зборы Клашы, спахмурнеў. Устаівіўся запытальна вачыма на Верачку. Тая сьцепанула плячмі: "Нічога ня ведаю". Тады да Клашы: "Клаўдзія Пятроўна, сягоньня мы яшчэ ў тыл ворага не паляцім. Сягоньня ў 10 ноль-ноль апошнія скачкі. Так што, ранавата стала пакавацца..."

Клаша прысела на раскладушцы, запрасіла Алёшу прысесьці на табурэтцы, але ён падзякаваў і папрасіў Верачку "выйсьці на хвілінку". Верачка хутка выканала просьбу, пад дзьвярыма не падслухоўвала сакрэтаў, а зайшла ў прыбіральню. Аляксей Рыгоравіч Новік на просьбу Клашы, дазволіць ёй зьезьдзіць дадому, адказаў катэгрычна "нет". "Папершае, — казаў ён — немцы ўжо набліжаюцца да Варонежа, а, па другое, мы хутка паляцім выконваць заданьне..."

Клаша стала распакоўваць чамаданчык, а Новік запытаў: "Хаця я ня вельмі веру Арыне Максімаўне, бо добра, здаецца, яе ведаю, але раз ад яе паступіў "сыгнал", я адмахвацца ад яго не магу і мушу запытаць: ці праўда, што ты, Клаша, маеш нарачонага, які... ня наш чалавек?" Клаша хутка зрэагавала: "А не абвінавачвала Вас Арына Максімаўна ў тым, што Вы закахаліся ў сваю курсантку, у якое маецца нарачоны, "ня наш чалавек"?.. Аляксей Рыгоравіч зачырванеўся, бо Клаша як у воду глядзела, але засупярэчыў: "Хто табе, Клаўдзія Пятроўна, такую дурніцу сказаў? Калі чалавеку нехта падабаецца, дык гэта не азначае, што ён у таго "нехта" закаханы. Ды адкуль Арыне Максімаўне ведаць, у каго я закахаўся?

— Усе дзяўчаты пра гэта плявузгаюць. Арына Максімаўна мае добрыя вушы. І язычок... Ёй, мабыць, баліць, што Вы ў мяне закахаліся, а таму і выдумляе усялякіх нарачоных, пра якіх я і ня сьніла...

Аляксей Рыгоравіч ня быў-бы энкэвадэшнікам, каб не здагадацца, што Клаша ведае пра яго сувязі з Арынай Максімаўнай, а таму ўзяў Клашу за руку і, моцна паціскаючы, далікатна прамовіў: "Забудзем пра гэтую гутарку. Толькі не забудзь, Клашуня, што я цябе... паважаю.

"Паважаеце? — перапытала Клаша і, натапырыўшы чырвоненькія вусны, пакрыўджаным голасам прамовіла: "Каб Вы мяне паважалі, не сказалі-б "нет", а дазволілі зьезьдзіць дадому..."

Аляксей затрымаўся каля дзьвярэй, паглядзеў прыстальна на Клашу, якая засмучаная стаяла каля століка, вагаўся над пытаньнямі: "дазволіць і прыблізіць да сябе", ці "недазволіць і..." Рашыў дазволіць: "Клаша, можаш ехаць, але заўтра каб была тут..."

(Працяг будзе)

Мой побыт на Беларусі

У жніўні 1989 году я меў магчымасьць адведаць свой родны край не як турыст, але як госьць, прыехаўшы да сваіх родных, у сваю вёску, дзе радзіўся, дзе рос, дзе хадзіў у пачатковую школу, а пасьля, у часе Другой сусьветнай вайны, паступіў у Маладэчне ў гандлёвую школу.

Для тых чытачоў, якія ніколі не былі, а мо нават і ня ведаюць, дзе знаходзіцца Маладэчна, дык гэта 75 кілямэтраў на паўночны-захад ад Менску. Зноў-жа трэба ўспомніць, што ў палове дарогі з вакна вагону можна ўбачыць хатку, якая цяпер сталася народным музэям, дзе жыў і працаваў наш слаўны паэт Янка Купала.

Вязынка для беларусаў, як "Дызнылэнд" для амэрыканцаў. Яна прываблівае сюды што год дзясяткі тысяч ня толькі беларусаў і людзей з суседніх рэспублік, але таксама тысячы замежных турысаў. Аб ёй складаюцца песьні, легенды. Не хапае слоў, каб апісаць маляўнічы краявід: лясныя пагоркі, курганы, невялічкія вазёры, якія мільгаюць перад вачыма, калі падяжджаеш і мінаеш Вязынку.

"Вязынка, — піша М. А. Чарскі ў кнізе "Вязынка" (Выдавецтва "Полымя", 1986) гэта скарбніца, у якую сабраны: водыр нашых ніў, сенажацяў, лясоў, гэта — летапіс жыцьця народа з яго звычаямі, марамі, імкненьнямі, барацьбой, перамогай. Вуснамі Я. Купалы гаворыць Беларусь".

Прыгожыя словы, як і сама Вязынка. Але, хто ведае, што на гэта сказаў-бы Янка Купала, каб мог ён пачуць, што амаль уся Беларусь, а асабліва моладзь і большасьць інтэлегэнцыі сягоньня гавораць не яго вуснамі, а вуснамі Пушкіна, Дастаеўскага.

У першы тыдзень побыту ў Маладэчне я даведаўся з рэклямы вячэрняй газэты, што тут ёсьць "Беларуская хатка", адчыненая для ўсіх кожны чацьвер а 7-ай гадзіне вечара. Я хутка пазнаёміўся з кіраўніком "хаткі", маладым хлопцам Міхасём, які, як пазьней аказалася, хадзіў у тую самую пачатковую школу, што і я ў вёсцы Палачаны. Ён мне хутка расказаў, што ў гэтую Хатку прыходзяць ня толькі маладыя, але і старэйшае грамадзтва. Мэта зборак — беларуская мова, літаратура, мастацтва, а таксама дыскутуюць і іншыя справы штодзённага жыцьця. Мая сустрэча з кіраўніком "Беларускай Хаткі" адбылася ў яго памешканьні. Перш, што кінулася мне ў вочы, гэта вялікая Пагоня. З левага боку партрэт Я. Купалы, з правага — Я. Коласа. На другой сьцяне партрэт М. Багдановіча і шмат іншых беларускіх паэтаў, пісьменьнікаў і народных герояў-дзеячоў. Было шмат партрэтаў, краявідаў, апрацованых малярамі-мастакамі сёньняшняга Маладэчна, з якімі я меў гонар крыху пазьней пазнаёміцца і пагутарыць. З вялікім энтузыязмам яны гаварылі аб перабудове, аб беларускім адраджэньні і якія яны спатыкаюць перашкоды. Бадай самая галоўная і адначасна балючая — абыякавасьць людзей, і дзеля таго прагрэс вельмі павольны.

Наступнага вечара Міхась — кіраўнік "Хаткі" — быў заняты іншымі грамадзкімі справамі, дык мною заапекаваўся малады мастак (таксама Міхась), які паказаў мне сваю студыю і некалькі прыгожых малюнкаў. З вялікім гонарам я атрымаў ад яго адзін малюнак як падарак у час нашай сустрэчы. Пазьней ён запрапанаваў мне пайсьці на рэпэтыцыю "Кастусь Каліноўскі", якая адбывалася ў клюбе чыгункі.

Пасьля рэпэтыцыі мы доўгі час яшчэ стаялі на падворку, любаваліся прыродай і цёплым жніўеньскім вечарам. У вясёлай і сяброўскай атмасфэры я павіншаваў "Кастуся Каліноўскага" з яго патрыятычна-драматычнай адозвай да беларускага народу з пад "шыбяніцы". "Гэта адозва — гаварыў я, — павінна разчуліць сэрцы найбольшых пэсымістаў, ды крануць, як кажа прымаўка "за жывое", давясьці слухачоў да сьлёз і прышчапіць яшчэ большую любоў да свае мовы, народу і нашага краю. Толькі тады, калі мы пачнём ганарыцца нашымі продкамі і іхным адвечным змаганьнем за лепшую волю, долю, за справядлівасьць, мы сустрэнем лепшае заўтра і зоймем сваё пачэснае месца сярод іншых народаў". Да нашай гутаркі далучыліся два студэнты, з якімі я пазнаёміўся і даведаўся, што яны прыехалі з Менску, каб са мной спаткацца. Гутарка вялася на розныя тэмы, — мы раўнялі, параўноўвалі сёньняшнюю адукацыю і яе тэхніку, гаварылі аб іх студэнцкіх абставінах, недахопах, цяжкасьцях, аб самой перабудове, адраджэньні, і што гэта ўсё прынясе нашаму беларускаму народу.

Кожнаму ведама, час у вясёлай кампаніі ляціць без аглядкі і, каб хоць крыху прадоўжыць наша пешаходнае падарожжа, там-сям

мы супынялiся, тады паважная гутарка перапляталася анекдотамі, жартамі, і рэха сьмеху кацілася ў няведамую даль па шырокіх вулiцах маладэчна.

На падыходзе да таго месца, дзе калісьці стаяла Гандлевая школа, мае думкі, як тыя нястрыманыя коні, ляцелі у мінуласьць. І хто ведае, дзе-б яны затрымаліся, каб я ня глянуу у вок Міхася-мастака і пад расхрыстаным яго пінжаком ня уоачыу прышпіленую да кашулі эмблему — Пагоня з надпісам "Жыве Беларусь". Мае коні, якія рваліся з успамінамі ў далёкую мінуласьць, раптам затрымаліся — быццам-бы па загаду рыцара Пагоні. Я яшчэ раз глянуў на круглую, дыямэтрам крыху больш ангельскіх 50-т пэнсаў Пагоню і, каб затрымаць сантымэнтальнае падарожжа ў маладыя школьныя гады, спытаў Міхася, дзе можна купіць гэтую Пагоню, бо я хацеў-бы завесьці некалькі ў Англію як падарунак сваім сябром. Міхась крыху задумаўся, паківаў галавой і адказаў, што, на вялікі жаль, дамаганьні Пагоні перавышаюць іх выраб і на гэта трэба чакаць даволі доўга. Але, прайшоўшы некалькі крокаў, ён затрымаўся, зьняў са свае кашулі Пагоню і быццам, дэкаруючы мяне, прычапіў яе да майго пінжака. Ён моцна паціснуў маю руку і сказаў: "Ад Міхася-мастака для паважанага госьця з Англіі — Алеся". Я яму шчыра падзякаваў і, каб падтрымаць далейшую гутарку (бо ўспаміны мінуласьці зноў пачыналі мільгаць прад маімі вачыма), я спытаў Міхася, ці гэта тут дазваляецца? На вуснах яго пракацілася нейкая ўсьмешка, і ён адказаў: "Дазваляецца, ці не, але, як бачыш, мы яе носім". Пасьля некалькіх хвілін ён з той-жа самай усьмешкай пачаў мне расказваць, што аднойчы і толькі раз затрымаў яго міліцыянэр у Менску і загадаў яе зьняць. "Пагоню ці кашулю — спытаў міліцыянэра Міхась. Той, відаць, не пазнаў жарту і больш паважным і аўтарытэтным голасам загадаў яму зьняць Пагоню. Але, як аказалася, нашага маладога мастака ня так лёгка запалохаць, ён пачаў упірацца ды "таргавацца" з міліцыянэрам. Той урэшце здэцыдованым голасам паўтарыў трэці і апошні раз зьняць Пагоню, ды толькі! Але і наш мастак аказаўся таксама "ўпарты" і адказаў міліцыянэру крыху павышаным голасам, што. калі думаеш, што можаш зьняць, дык папрабуй! Той, глянуўшы на Міхася з ног да галавы, махнуў рукою, нешта мармынуў сабе пад носам, ды сказаўшы: "Пайшоў ты к чорту" — адвярнуўся і пайшоў... Мне зноў хацелася паціснуць руку Міхася і сказаць "Малайчына". Дай Бог каб у нас было больш такіх Міхасеу і каб яны ніколі ня зводзіліся!..

Зьбліжаючыся да канца нашага падарожжа, я яшчэ меу прыемнасьць пазнаеміцца з адным маладым мужчынам, які, як пасьля аказалася, быў журналістам з радыё БССР у Менску. Вымаючы з верхняй кішэні пінжака сваю рэпрэзэнтанскую картку, ён сказаў, што прыехаў спэцыяльна з Менску, каб зрабіць са мной інтэрв'ю, запісаць гэта усё на плёнку. "Чаму-ж не" — адказаў я. Але, паколькі гэта была ўжо позная ноч (а я таксама тут госьць), я мусіў спытацца сваёй плямяньніцы. Яна, як заусёды, была вельмі гасьцінная, хутка прыбрала нам асобны пакой і ветлівым голасам запрасіла журналіста зайсьці. Плямяньніца зачыніла за намі дзьверы, і журналіст выняў магнітафон, і мы пачалі размову. Наша гутарка ня была фармальнай, або падрыхтованаю. Усё гаварылася, як кажуць, "проста з моста". Праз нейкіх 30 хвілінаў ён выключыў магнітафон (магчыма, каб даць мне адсашнуцца) і заўважыў, што прайшло больш як 40 год, а я добра валодаю беларускай мовай. Таксама яго дзівіла, што праз увесь час нашага інтэрв'ю я ні разу ня глянуў на якія-небудзь запіскі, а ўсё гаварыў з галавы. "Ці я ня пішу што небудь у газэты або журналы?" — урэшце спытаў ён мяне. — Так, — адказаў я. — Будучы яшчэ вучням 5-га класу пачатковай школы ўПалачанах, я быў адказным рэдактарам "сьценнай газэткі", а пасьля ў Маладэчне я належаў да гуртка маладых паэтаў і пісьменьнікаў." І я прдэклямаваў яму некалькі сваіх вершаў. Але, магчыма, найбольшым маім дасьведчаньнем у напрамку літаратуры і мастацтва была праца з Хведарам Ільяшэвічам у так званым пераходным лягеры Д. П. у Нямеччыне, у Ватэнштэце. Там, што тыдня мы наладжвалі літаратурна-мастацкія вечары ў форме "жывой газэткі", дзе мае вершы і фэльятоны былі вельмі папулярныя. На вялікі жаль, мой "настаўнік" і супрацоўнік — Хведар Ільяшэвіч — паэт, пісьменьнік і магістар фільязофіі загінуў трагічна ў аварыі ў даволі маладых гадох свайго жыцьця ў 1948 г.

У наступных словах нашага далейшага інтэрв'ю журналіст, як-бы ня думаючы, спытаў: "Я ведаю, што ў часе Другой сусьветнай вайны вы вучыліся ў Маладэчне ў Гандлёвай школе. Але, якім чынам вы апынуліся ў Нямеччыне? Добраахвотна, ці вас вывезьлі прымусова?" Я, добра падумаўшы, адказаў: "Пражыўшаму некалькі год пад "сталінскім сонцам" вялікага прымусу на вываз не было

патрэбы." Ён выключыў свой магнітафон і падзякаваў мне за мой час, а таксама, адыходзячы, перапрасіў маю плямяньніцу за нявыгадны час яго прыбыцьця.

Плямяньніца пачала падрыхтоўваць вячэру (хаця было ужо бліжэй раніцы), а я тым часам выйшаў на вэранду, каб падыхаць сьвежым паветрам і даць сэрцу крыху спакою. Вакол мяне была абсалютная начная цішыня, і неяк маркотна стаяў я адзін і ўглядаўся ў далёкае сіняе неба. Там-сям у вокнах яшчэ блішчэлі з-за фіранак малыя аганькі. Вецер лёганька павяваў і калыхаў ліскі дрэў, якія стаялі ўздоўж тратуару, спусьціўшы свае змучаныя кароны ад штодзённай сьпякоты. Атраснуўшыся ўрэшце ад пылу грузавых машын і аўтабусаў, яны безтурботна драмалі, так як і дрэмлюць людзі. Каля шашы, нейкіх сто мэтраў ад нашага будынку, час ад часу па дарозе праходзіла маладая пара, трымаючыся за рукі — пэўна вяртаюцца з пагулянкі. А я стаяў далей на вэрандзе і без канца ўглядаўся ў гэтае цудоўнае неба, як быццам-бы нечага шукаў, але ня ведаў чаго. Яшчэ адна пара прамінула наш будынак і вольным крокам павярнула ў той бок, дзе калісьці стаяла Гандлёвая школа. Гэтым разам і я ў думках пакрочыў у сьлед за імі, трымаючы за руку сваю прыгожую студэнтку. Вецер развейваў яе доўгія косы, закрываў яе вочы, і яна элегантным рухам аднэй рукі адкідала іх назад. Як і калісь, мы падыходзілі да таго месца, дзе заўсёды разьвітваліся да заўтрашняга дня. Але гэтым разам неяк хацелася, каб дарожка працягнулася, каб ёй не было канца. Але вось ужо і жалезна-чыгуначны масток, дзе крыжуюцца дарогі. Мы спыніліся. Я, як ніколі, ўглядаўся ў яе сінія вочы і хацеў ёй нешта сказаць, але не хапала слоў. Замест, я яшчэ мацней паціснуў яе руку і, быццам-бы у адказ, яна прытулілася бліжэй да мяне. Пульс яе біўся мацней, і я мог чуць рытм яе сэрца. Раптам нашы вусны зьліліся, і я адчуў цяплыню яе цела. Пасьля мы стаялі моўчкі праз некалькі хвілін і ўглядаліся адзін у другога вочы. Урэшце, я здолеў вымавіць "бывай", але вярнуўся і яшчэ раз пацалаваў яе прагныя, мягкія вусны. У яе прыгожых, але гэтым разам сумных вачах, пакаціліся сьлёзы, якія яна выціралa рукою і шэптам маўляла — "бывай — буду чакаць". Я, прайшоўшы, аглянуўся назад, а яна стаяла там, махаючы гэтым разам белай хустачкай, і яе словы даляталі, як рэха, "буду чакаць, буду чакаць..."

І хто ведае, мо' блізка ці далёка ў гэту жнівенскую ноч і яна стаіць, як і я, і ўглядаецца ў гэтае сіняе неба, і мо' таксама нечага шукае і ня ведае чаго...

Мая галава яшчэ шумела ад хмелю даўных пацалункаў, і я не пачуў, як з заду заскрыпелі дзьверы. Цёплая рука абняла мяне за шыю, і мая плямяньніца, быццам чытаючы мае думкі, сказала ціхім, спакойным голасам: "Дык пэўна ўжо яна ня прыйдзе". Узяўшы яе за руку, як калісьці студэнтку, мы ўвайшлі ў пакой і быццам сам сабе я сказаў: "Ня прыйдзе, — мо' лепш і ня трэба..."

На заўтра быў дзень адпачынку, і я пастанавіў адведаць сястру ў вёсцы дзе я радзіўся. Увечары я вярнуўся ў Маладэчна, і мяне сустрэла на панадворку наша суседка і бажылася і клялася, што яна ўпоўдзень слухала радыё і із Менску пачула мой голас. "Ня ведаю, — адказаў я. — Сяньня я быў у Палачанах..."

Людзі Маладэчна вельмі гасьцінныя: дабрадушныя і памяць аб іх у мяне застанецца надоўга. Ня гледзечы на штодзённыя недахопы ў магазынах, яны вясёлыя і жартаўлівыя. Адно, што найдаўжэй застанецца ў маёй памяці, гэта вечар, калі 14-ці гадовая дзяўчына — дачка маёй плямяньніцы — запрапанавала паказаць мне адзін з прыгожых паркаў, з рознымі разрыўкамі і гульнямі для дзяцей. Спацыруючы з ёю, я заўважыў, што амаль кожны праходжы прыглядаўся, што гэта такое ў мяне на кашулі. Я дзеля цікавасьці спытаў сваю праваднічку, можа было-б лепш для яе, калі-б я зьняў і палажыў у кішэню Пагоню. Яна крыху скрыўджаным позіркам глянула на мяне і адказала: "Дзядзя, тым, чым гардзіцеся вы, тым самым гарджуся і я". Былі гэта найпрыгажэйшыя для мяне словы на працягу майго побыту на Беларусі. І яны застануцца ў маёй памеці так доўга, як доўга буду жыць.

На працягу чатырох тыдняў майго пабыту ў роднай мясьціне, ня толькі мае родныя, але і іх суседзі як-бы "пераключыліся" і ўсе пачалі гаварыць ня толькі да мяне, але і між сабою на сваёй роднай беларускай мове. Жонка майго плямяньніка, якая працуе ў ступені тэхніка на найбольшым заводзе ў Маладэчне (5 тысяч рабочых, амаль усе жанчыны) расказвала, што аднойчы дырэктар завода спыніў яе, спытаўся, што з ёю сталася, што яна ня так гаворыць, як калісь?

У апошнім тыдні свайго пабыту я меў вялікі гонар спаткацца і пагутарыць з Г. А.

Каханоускім, ведамым на усю Беларусь, які падарыў мне кнігу "Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі у XVI-XIX ст. ст.". У кнізе маецца яго уласнаручны подпіс — "Паважанаму Алесю Гатковічу з прыемнасьцю — у час сустрэчы ў Маладэчне 21 жніўня 1989 г."

Наступнага вечара я таксама быў вельмі рады сустрэцца і пагутарыць з другім добра ведамым навукоўцам ня толькі на Беларусі, але і за яе межамі — М. Е. Ермаловічам. Ен таксама на разьвітаньне падарыў мне з уласнаручным подпісам яго выданьне — "Па Сьлядох Аднаго Міфа". Яго гістарычныя нарысы "Старажытная Беларусь", апублікаваная у месячніку "Маладосьць", ня толькі цікавыя зьместам, але старадаўнімі манюмэнтамі, палацамі, гэрбамі і фотаздымкамі князёў нашага Вялікага Княства Літоўскага.

Гэта кніжка выклікала захапленьне сярод чытачоў, і паштовая скрынка ў рэдакцыю была перапоўнена лістамі. Адзін з чытачоў пісаў у рэдакцыю "Маладосьць" №10/88, заканчываючы словамі: "Гэта кніжка — гэта сапраўднае сьвята для ўсіх, хто шануе родную гісторыю, родную мінуўшчыну". Я атрымаў шмат падарункаў у форме літаратуры і ад іншых маладых паэтаў, пісьменьнікаў, студэнтаў, мастакоў, безумоўна ад Міхася — кіраўніка "Беларускай Хаткі".

Два дні перад маім ад'ездам, у "Беларускай Хацы" адбылася зборка актыву (каля 30-ці асоб), каб выбраць часовае кіраўніцтва для падрыхтоўкі Агульнага Зьезду "Таварыства Беларускай Мовы імя Францішка Скарыны". На гэтую зборку быў запрошаны і я. З вялікай цікавасьцю я прыглядаўся і прыслухоўваўся, з якім энтузыязмам беларуская моладзь падыходзіць да кожнай справы адносна Беларускага адраджэньня, сваёй роднай мовы, літаратуры, мастацтва.

Пасьля заканчэньня афіцыйна-фармальных справаў, я, як госьць і былы выхаванец Маладэчна, быў запрошаны сказаць слова і выказаць свае погляды аб тым, што бачыў на Беларусі ў часе свайго кароткага пабыту. Па колькі гэтая зборка была прысьвечана Беларускай мове, таму я пачаў словамі Я. Купалы, зазначаючы, што ён мне даруе, калі я зьмяню яго адно слова, і я пачаў: "Не пагаснуць зоркі ў небе, пакуль неба будзе, не загіне наша мова, пакуль будуць людзі". Наша мова, наша літаратура, наша мастацтва, ніколі не загіне — працягваў я, — бо якраз такімі людзьмі зьяўляецеся вы і шмат іншых, як вы, ў кожнай малой ці вялікай вёсцы, у кожным мястэчку, ва ўсіх гарадох Беларусі. На вашых плячах вялікі цяжар, вялікая адказнасьць перад беларускім народам. Ад вас і толькі ад вас будзе залежыць, у якім напрамку будзе узгадавана нашая беларуская моладзь. Кожны з нас ведае, што толькі на добра зааранай глебе можа узыйсьці маладая рунь. Але я ў гэтым пераконаны і ў гэта веру, што гэты абавязак вы выканаеце. Калі сотні год таму назад беларуская маці-сялянка змагла перахаваць гэтую мову і перадаць наступнаму пакаленьню, толькі пяючы песьню у беларускай мове над калыскай свайго дзіцяці, дык сёньня, маючы свае школы, універсытэты, маючы сваіх выдатных навукоўцаў, паэтаў, пісьменьнікаў, гісторыкаў ды філёзафаў, гэтыя запаветы ня толькі зможаце перахаваць і перадаць наступнаму пакаленьню, але перадасьце іх у шмат багацейшай форме. Што гэта ня будзе лёгка, рэч ведамая. Так, як і раней, будуць спробы, каб перашкодзіць, заманіць. А перашкоды і мана былі не малыя. Калі мы вярнёмся ў нашу мінуўшчыну, дык мы ўбачым, што цэлымі стагодзьдзямі праз нашы землі праходзілі цэлыя полчышчы ваякаў, узброеныя ў панцыры з ног да зубоў, пазьней мадэрныя арміі з найвышэйшай зброяй. "Тут, — як кажа паэт, — схадзіліся плямёны спрэчкі сілаю канчаць." І ня раз нішчыўся наш край, ня раз з паверхні зямлі зьнікалі гарады і вёскі, ня раз зарава пажараў залівала нашае неба. І цэлымі стагодзьдзямі стагнаў наш беларускі народ і пад сацыяльным прыгонам і пад панскім бізуном. Дык нічога дзіўнага, што сягоньня ў Маладэчне, у Менску ды ў іншых гарадох і мястэчках Беларусі парожнія магазыны, чэргі без канца... Віна ў гэтым не беларусаў. Ня мы давялі наш край да такой стагнацыі, да такога эканамічнага залому. Мы былі гаспадарамі сваёй зямлі, свайго лёсу. У той час, калі заходня-эўрапейскія дзяржавы разьвіваліся ў дэмакратычных умовах, прабівалі дарогу да палепшаньня формаў сацыяльнага жыцьця, беларускі народ быў бяспраўны і безгалосы, яго шлях значылі заўчасныя магілы і крыжы. І прайшоўшы гэткі горкі этап, прайшоўшы турмы Картуз-Бярозы, прайшоўшы ссылкі далёкай Сібіры і Калымы, — не аднаму здавалася-б, што з беларускага народу, з беларускай душы не застанецца і сьледу.

Аднак, дзякуючы якраз гэтай любові, дзякуючы гэтым запаветам, якія мы атрымалі ў спадчыне, якія мы ўрачыста з году ў год сьвяткуем, наладжваем пастаноўкі аб нашых гэроях-змагарох, — мы, як народ, не залама-

ліся і не заломімся. І згодна народнай пасловіцы "сьледам за дзедам" цягнецца ніць нацыянальнага жыцьця, што і зьяўляецца найлепшай зарукай няўміручасьці нашага народу. З улоньня аднаго пакаленьня прыдзе другое, і гэтых натуральна-нацыянальных традыцыяў не парваць ніякім сілам. Будзе жыць наш народ, будзе жыць наша мова!" І на заканчэньне яшчэ раз я паўтарыў словы Янкі Купалы "Не пагаснуць зоркі ў небе..."

Пасьля зборкі я сустрэў некалькі сяброў з маладых гадоў з Гандлёвае школы. Было шмат гутарак, але на вялікі жаль, на гэта не было шмат часу. Мне трэба было разьвітацца і зьбірацца ў паваротную дарогу. Паціскаючы рукі, ў мяне і ў іншых пакаціліся сьлёзы. Сьлёзы радасьці, смутку, разлукі — ня толькі са сваімі роднымі, але і ўсімі маладэчанскімі хлапцамі, дзяўчатамі і горадам Маладэчна. Праз гэтыя чатыры тыдні я яшчэ раз быў малады, і думкі-успаміны не далі і не даюць супакою цэлымі начамі да сёньняшняга дня.

Сёньня я маю цесную сувязь ня толькі са сваімі роднымі, але і іншымі людзьмі, якіх я меў гонар сустрэць у часе свайго кароткага пабыту. Некалькі месяцаў таму назад Міхась — кіраўнік "Беларускай Хаткі" прыслаў мне ліст і піша, што ім сумна без мяне і яны часта ўспамінаюць мяне. Далей паведамляе, што Агульны Зьезд адбыўся вельмі добра. Было прысутных 350 асоб. Сярод іх шмат моладзі. Выбралі Раду ў колькасьці 30 чалавек — двух намесьнікаў і старшыню. Волею лёсу і людзей — піша Міхась, — яго выбралі старшынёю. З гэтым віншую Цябе, Міхась, а таксама землякі жадаюць Табе вялікх посьпехаў. Я ўпэўнены, што абавязак, узложаны на Цябе, Ты выканаеш з гонарам і нам будзе прыемна чуць аб Вашай беларускай дзейнасьці.

Алесь Гатковіг Англія

Надзя АРТЫМОВІЧ

***

Ікона
лістападаўскі сьнег
блакітны ранак
сон адкрылы і лёгкі
у блакітным люстры
стаю
хвіліна прыгожасьці
акіян хараства
хвіліна
веру ў вечнае харство
веру ў адно нявыказанае слова
веру ў белае маўчаньне
веру у Бельску — камень і крыж
веру у Бельску — блакітны туман
Бельск — ікона малітва сон жыцьцё

сьнежань, 1989 г.

Бельск

ПРАСТУПНЫ ВЫБРЫК ВАТЫКАНА

У нумары 12/519 за 1990 год польскага часапісу "Культура", які выходзіць у Парыжы, быў надрукаваны на 93 балонцы артыкул Домініка Моравскага пад загалоўкам: "Біскупы з Усходняе Эўропы иа Сынодзе". Гэта быў ужо восьмы з чаргі Сынод Біскупаў, прысьвечаны шкаленьню сьвятароў у актуальных акалічнасьцях. Гэты Сынод, які працаваў праз амаль цэлы кастрычнік, увойдзе ў гісторыю Касьцёла таксама з прычыны ўтварэньня асобнае славянскае моўнае групы, г. зв. circulus minor.

Гэтым разам прысутнічалі ўсе Біскупы з сярэдня-ўсходняй Эўропы ў тым ліку і Біскуп з Беларусі Тадэуш Кондрусевіч. На Сынодзе Біскуп Беларусі сказаў, што амаль 300 парахвіяў мае да дыспазыцыі няцэлую сотку сьвятароў разам "пазычанымі". А сярод сьвятароў Беларусі, стала там працуючых і кананічна да гэтае агромнае дыяцэзыі належачых, каля 20 маюць па-над 80 гадоў. Далей Біскуп Кондрасеіч Домініку Моравскаму сказаў, што найбольш пільнай патрэбай цяпер ёсьць пераклад на расейскую мову (бо польская мова ня ёсьць дастаткова ведама) падручнікаў да навукі ў сэмінарыях. А чаму не на беларускую?

Праваслаўная царква праводзіць у Беларусі русыфікацыю, а каталіцкая — ёй дапамагае. Што гэта? Помста беларусам-каталіком за тое што не паддаюцца палянізацыі? Падзяка Гарбачову за дазвол адчыняць касьцёлы? І тое і другое. А разам — праступства у адносінах да беларускага народу.

Аглядальнік.

ПАРАСТКІ ГАЛОСНАСЬЦІ

"Наша слова" — бюлетэнь Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны. Першы нумар выйшаў у сакавіку 1990 г. Аддрукавана на Менскай фабрыцы "Чырвоная зорка" МВПА імя Якуба Коласа. Тыраж 6500 экз. Старшыня рэдакцыйнай калегіі — Ніл Гілевіч. Сябры калегіі: Янка Брыль, Уладзімер Дамашэвіч, Алесь Камароўскі, Анатоль Клышка, Ігар Лапцёнак, Генадзь Мацур, Зьміцер Санька, Мікола Супрановіч, Алесь Траяноўскі, Генадзь Тумаш, Яўген Цумараў, Генадзь Цыхун. Бюлетэнь выходзіць раз на месяц. Выданьне безганарарнае.

Адрас: 220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13. Цана 20 капеяк.

"Грунвальд" — навіны беларускага адраджэньня.

Інфармацыйны бюлетэнь беларускага культурнага таварыства "Грунвальд".

"Газэта 'Грунвальд' " — незалежнае выданьне і не зьяўляецца органам беларускага ці эстонскага народнага фронту.

Першы нумар выйшаў у сакавіку 1990 г. Рэдактар — Валеры Чыжык. Надрукавана у друкарні "Октрообер". Цана ў Эстоніі 30 к., за межамі 50 к.

Адрас: 200090 Эстонія, Талін Аб/Скр. 3290.

"Праграмныя дакуманты БНФ 'Адраджэньне' ": "Зварот да грамадзян Беларусі", "Праграма", "Статут", "Ухвалы (рэзалюцыі) Устаноўчага зьезду".

Менск 1989 г. Зборнік падрыхтаваны рэдакцыяй друкаваных органаў БНФ "Адраджэньне".

"Навіны" Беларускага Народнага Фронту за перабудову "Адраджэньне". Выданьне арганізацыйнага камітэту. Нумар 1 (3) 1989 г. Па даручэньні Аргкамітэту нумар падрыхтавалі: А. Суша, А. Радкевіч і інш.

"Абуджэньне" — весьнік магілёўскай Рады Беларускага Народнага Фронту. № 1, жнівень 1989 г. Нумар падрыхтавалі: М. Булавецкі і В. Васількоў.

"Студэнцкая думка" — ворган студэнтаў канфэдэрацыі беларускіх суполак. У нумары 5 за сакавіка 1989 г. ў уступе чытаем: "Перад вамі чарговы нумар "Студэнцкае думкі", падрыхтаваны супольнымі намаганьнямі сяброў двух студэнцкіх згуртаваньняў: Сьвітанак" (Тэхналягічны інстытут) і "Крывічоў" (Пэдагагічны інстытут).

Нумар пяты падрыхтавалі: Аніськова Галіна, Барпенава Ганна, Кавальчук Алена, Алесь Гуркоў, Аляксей Рагуля і інш.

Адрас: Беларусь, 2200100, Менск, вул. М. Горкага, д. 143, кв. 65.

"Эксрэс" — аднадзёнка Беларускага Народнага Фронту, выпуск 2, травень 1989 г. Выданьне Аргкамітэту. Падрыхтавалі: А. Кавальчук, С. Драч.

"Праваслаўная думка" — незалежны часапіс праваслаўнае моладзі. Першы год выданьня, нумар першы. Год і месяц выданьня не абазначаны, "Часопіс не зьяўляецца органам афіцыйных царкоўных уладаў і адлюстроўвае думку незалежнае рэдакцыі. Бясплатна. Нумар выдадзены коштам рэдактара. Наклад 10.000. Ахвяруйце грошы ў фонд выданьня".

АНСАМБЛЬ "ЖЫВІЦА" Ў САЎТ РЫВЭРЫ

Менскі ансамбль "Жывіца" 15 верасьня 1990 г. пачаставаў беларусаў сокамі беларускай зямлі: вядомымі і невядомымііі песьнямі, гульнямі, дэклямацыямі, такімі як: "Вясковы марш", "Ты чырвоная каліна" (лягенда "Адкуль пайшла песьня), "Нёман", музыка Н. Сакалоўскага, словы Анатоля Астрэйка — Алесь Казак; тры "Полькі" — "Варанаўская", "Бараўленская", "Маслабойка" — выканала аркестра "Жывіца"; вясковая гульня: "Проса"; "У карагодзе мы бывалі"; "Із пад каменя" і "Ой, да гаем, гаем" — выканала Валянціна Пархоменка; "Вясельны вальс на саломе" — выканаў ансамбль; Жніўную песьню Гомельскай вобласьці выканала В. Пархоменка; "Плач на саломе" — выканаў Алесь Казак; "Птушачка маленькая" (сіроцкая песьня Брэсцкай вобл.) — выканала адзінаццацігадовая Волечка Казак; "Беларускія танцы" выканала на цымбалах Ганна Лікіне; Дзьве песьні: "Ой, у полі куст каліны" і "Навары, мілая" — выканала сямейнае трыо: В. Пархоменка, А. Казак, і Волячка Казак; "Сьвяты Мікалай" — выканаў Уладзімер Каштальян; Сцэну "Сватаньне" — выканалі: Алесь Казак, Валянціна Карэлікава, Лявон Хрыпаў і Уладзімер Каштальян; "Вясельны марш" — выканаў ансамбль; Вясельную песьню Брэсцкага Палесься "Як паехаў казачэнька з поля" — выканалі В. Пархоменка і Алесь Казак; Найгрыш

на дудзе "Дурнушка" — выканаў ансамбль; "Польку з бёрдамі" — солё В. Карэлікавай; Вясельную песьню "Каб табе, Басілько" — выканаў А. Казак; "Груздоўскую кадрылю" — выканаў ансамбль; Беларускую народную песьню "У садзе гуляла" — выканалі В. Пархоменка і А. Казак; "Шэрая малодачка" і польку "Букецік" — выканаў ансамбль; "Ой, там на таргу, на базары" — выканала В. Пархоменка; "Ой, я — прымак" — выканаў А. Казак; "Беларускія прыпеўкі" і "Польку-Агульніцу" — выканаў ансамбль.

Песьню-ж "Люблю наш край" разам з ансамблем сьпявала ўся вялікая грамада беларусаў.

Дзьве гадзіны без перапынку ліліся са сцэны "сокі" беларускай зямлі. Дьве гадзіны не змаўкалі галасы: "Брава, брава!.." Асабліва, калі сьпявалі Валянціна Пархоменка, ці Алесь Казак, Цудоўны ансамбль.

Ад імя ўдзячных слухачоў і гледачоў цёплымі словамі гасьцей з Беларусі вітала сп-ня Ірэна Цупрык, а таксама сп-ня Віла прадэкламавала прынагодны верш.

Арганізацыйны Камітэт (старшыня Міхась Бахар) пастараўся да "сокаў" "Жывіцы" дабавіць "сокаў" Амэрыкаскай зямлі — смачную вячэру.

Пасьля пад музыку аркестры Аляксея Альхоўскага доўга і весяла ўтрасаліся гэтыя амэрыканскія "сокі". А. "Жывіцы" "сокі" яшчэ доўга ня вытрасуцца із памяці тых, каму пашанцавала дастаць білеты...

М. Кавыль

З майго Юбілейнага вечара

"Дарагі і вельмі паважаны Спадар Язэп Лешчанка!

Усе харысты і рэгэнт жадаем прывітаць Вас з нагоды Вашага дня нараджэньня і як ведамага беларускага паэта, і як грамадзкага дзеяча.

Ваш талент і шчырае беларускае сэрца ўзбагацілі нашую літаратуру, і людзі чытаюць яе з прыемнасьцю. Таксама цэнім Вас як карыснага сябру нашага хору.

Жадаем Вам добрага здароўя і сіл для працы яшчэ на Многая Лета!

Шчасьці Вам, Божа!

За хор — *Міхась Палюховіг*

Янка Золак

З НАГОДЫ ВЫХАДУ
"МІЖАГНЁЎЕ" М. КАВЫЛЯ

Міхась Кавыль, пакуль няхворы,
Задумаў выдаць свае творы.
Каб выдаць зборнік і харошы,
Знайсьці патрэбна многа грошай,
Дык ён пачаў шукаць дарогі,
Дзе-б мог "схапіць быка за рогі".
Але тут з мэтай дапамогі,
За справу ўзяўся Інстытут.
І стаў Міхась на шлях пакут.
Ішоў па ім і муляў ногі,
Аж дзесяць год цярпеў ён мукі,
Каб "Міжагнёўе" ўзяць у рукі.
Цяпер гукаць мусіць па сьвеце:
"Гэй! Кніжку новую купеце!"

2 сакавіка 1991 г.

**
*

КАВЫЛЬ І СЛУЧЧАКІ

Ён сам случчак, але для сьмеху,
Па случчакох рашыў "праехаць".
І, за касу схапіўшы Музу,
Ён случчакоў узяўся тузаць:
Адных хваліў, а іншых ганіў
(Нібы іграў ён на аргане).
Ці ганіў іх, ці выхваляў,
Але па ўсіх "пракавыляў".

1961 г.

Дарагі Міхась

З нагоды Твайго сямідзесяці-пяцілецьця прымі мае як найлепшыя пажаданьні: здароўя і ўсялякай памыснасьці, далейшай плённай працы на беларускай ніве.

З пашанай Твой *Пётра Нядзьвецкі.*

На Случчыне Міхась радзіўся
І падрастаў таксама там,
Ды Бог падумаў... падзівіўся...
Направіў у Саўт Рывэр к нам.
Пакуль ён к нам сюды прыйшоў,
Шмат гора пережыў у скітаньні,
Няўзгоды розныя прайшоў

І па Нямеччыне блуканьні.
Ды сваю ліру не пакінуў,
Яе з сабою нёс увесь час.
У вершах у сваіх Радзіму
Ен славіў песьняй сярод нас:
Пра васілёчкі і пралескі,
Пра нашы нівы і лясы,
Пра Бацькаўшчыну нашай вёскі,
Пра жыта залатога каласы...
Вершы Твае да сэрца прамаўляюць
Падборам непаўторных слоў.
Таму заўсёды іх чытаюць,
Да іх вяртаюцца ізноў.
А Твая песьня "Васілёчкі"
Пры кожнай зборцы, увесь час
Прыпамінае тыя ночкі,
Кароценькія, кожны з нас.
З нагоды Твайго юбілею
Усяго найлепшага жадаем:
Здароўя, шчасьця і ідэяў.
Сто Год усе шчыра засьпяваем!

Сто Год, Міхась!
Пётра Нядзьвецкі.

На Вечары з кароткай характарыстыкай вершаў, зьмешчаных у "Міжагнёўі", выступаў доктар Янка Запруднік. Ён прыгадаў, што мой першы верш называўся "Лён", зь якога я памятаваў толькі два словы: "блакітнае полымя..." І гэта праўда. Пасьля Вечара я доўга думаў над гэтым "блакітным полымем" і вось што прыпомніў:

ЛЁН

Блакітным полымем шугае лён
Каля алешніку на полі.
Матулі й сёстрам сэрцы грэс ён
І мне уцехі спрагу ўтоліць.
Сядзім на ўзьмежку паміж васількоў.
"Яны ад лёну пасінелі?" —
Пытаю ў маці. — Ды не, ад вякоў
Яно такое гэта зельле.
Лён ня зельле, не трава-мурава —
Лён кашулямі нас атуліць.
А васількоў блакіт і сінява —
То-ж вочы сёстраў і матулі...

1929 - 1991 г.

"Слова", якое я меўся сказаць...
Паважаныя Спадары і Спадарыні!

Расейскі паэт Уладзімер Маякоўскі казаў:

"Мне ни коп, я не накопили строчки.
Краснодеревщики мне не носили мебель на дом.
И, кроме чистово вымытой сорочки,
Скажу по-совести: мне ничего не надо."

Як кажуць расейцы: "Свежо предание, но верится с трудом."

Настрачыў Паэт шмат "строчек" і меў за іх добры ганарар. Тое, што ён ня ўмеў ашчаджваць грошы (накапливать), "строчки" ня вінаваты. Вінаваты былі: Ліля Брык і "зялёны зьмей". Яны давялі Маякоўскага да таго, што яго "лодка любови разбилась о быт", і ён паставіў "точку пули в своем конце".

Сказанае Маякоўскім пра "строчки" і "сарочки" з большай падставай можа паўтарыць кожны эміграцыйны паэт. У тым ліку і я. Ніякага ганарару нам ціхто ня плаціць. Мне толькі радыястанцыя "Свабода", дзякуючы сп. Запрудніку, выдала ганарар за верш "Правакатарам". Вось і ўсё. Праўда, сп. Уладзімер Пеляса выдаў мой зборнік вершаў "Пад зорамі белымі". Пра які ганарар можна казаць, калі сп. Пелеса наўрад ці вярнуў патрачаныя грошы... Тое-ж самае можна сказаць і пра зборнік "Цяжкія думы", выдадзены Беларускім Дапамаговым Камітэтам; пра зборнік "Першая рана",, выдадзены ББФ у Англіі, ды і апошні зборнік "Міжагнёўе". Не падумайце, што я маю нейкія грашовыя прэтэнзыі да выдаўцоў. Барані Божа. "Мне дукатаў, ні славы ня трэба, — пісаў я ў адным вершы, — Я й пад плотам сабе нагарода." А ганарар для мяне — мае зборнікі. Каб не сп. Пелеса, не нябожчык сп. Барыс Шчорс, не кіраўнікі БНФ у Англіі, каб не Спадарства Кіпелі і ня Ваша, дарагія суродзічы, ахвярнасьць, мае-б вершы не пабачылі сьвету. А таму — шчырае Вам усім дзякуй!

Міхась Кавыль

СЬВЯТОЙ ПАМЯЦІ ЖЭНЯ ЦЯРПІЦКАЯ

Складаем самае найглыбейшае спаўчуваньне сябру рэдакцыйнае калегіі Віталію Цярпіцкаму, яго дачушцы Ніле і брату ў Англіі з прычыны напаткаўшага іх гора — сьмерці жонкі, маткі і сястры сьв. п. Жэні Цярпіцкай дня 11 лютага1991 году.

Нарадзілася 5 жніўня 1928 г. ў засьценку Сялец, на Бабруйшчыне, у сям'і Ярмалінскіх.

Шчасьлівае дзяцінства перарвалі вядомыя арышты нявінных сялян, у ліку якіх трапіў і яе бацька.

Пасьля распачалася Другая Сусьветная Вайна, падчас якой варожы элямэнт спаліў жыўцом яе родзічаў.

У палове чэрвеня 1944 году з бацькамі і братам выехала ў чужыну і нязнаны Захад, каб пазьбегчы "савецкага раю". Пасьля пэўнае вандроўкі апынулася ў Нямеччыне. Тут прышлося працаваць у хэмічнай фабрыцы і іншых мейсцах да заканчэньня вайны. Найгорцыя асталіся ўспаміны пра тыя страшэнныя часы, калі нявінных людзей сілай аддавалі аліянты Саветам. Цудам уцалелі, папаўшы ў падобную сытуацыю. Пасьля доўгага вандраваньня трапілі ў беларускі лягер "Ватэнштэт". У памяці Жэні асталіся прыемныя ўспаміны пра добра арганізованае лягернае жыцьцё. Хадзіла ў гімназію, належала да скаўтаў, сьпявала ў хоры і г. д. У 1947 годзе паўстала магчымасьць выяжджаць на працу ў іншыя краіны сьвету. Такой першай краінай была Англія. Выехала туды ўся сям'я Ярмалінскіх. Распачалі працу ў тэкстыльнай прамысловасьці. Гэта быў пачатак новага шчасьлівага жыцьця, аб якім шмат успамінала. Тут належала да розных беларускіх арганізацыяў, таксама любіла наведваць праваслаўныя багаслужбы, дзе і сустрэла Віталія. Раман, і ў дзень Пакровы Прэсьвятое Багародзіцы, 14 кастрычніка 1950 году, — вясельле. Разам працавалі для пашырэньня беларускага нацыянальнага жыцьця ў Англіі. Сьпявалі дуэты падчас нацыянальных сьвятаў, а Жэня праславілася прыгожай дэкламацыяй вершаў.

Эканамічная пэрспэктыва жыцьця ў Англіі была агранічаная. У канцы лістапада 1951 году вырашылі выяхаць у Амэрыку. Лёс судзіў спыніцца ў нова-заснаванай беларускай калёніі ў Саўт Рывэр. Пачаткі былі цяжкія, асабліва сумавала па бацькох і брату, з якімі рассталася першы раз у жыцьці. У хуткім часе радзілася дачушка Леаніла, купілі собскую хату, і жыцьцё пайшло па амэрыканску — запанаваў дабрабыт. Абое прынялі актыўны ўдзел у грамадзкім і царкоўным жыцьц. Жэня любіла сьпяваць ад маленства, таму ўдзельнічала ва ўсіх існуючых хорах таго часу. Асаблівай прыкметай яе характару была надзвычайная памяць і добрая дыкцыя. Славілася дэклямацыяй розных вершаў і паэмаў, як "Курган" і іншых падчас нацыянальных сьвятаў.

Ведамая была таксама і сваёй гасьцінасьцю, дзеля таго не прыходзілася сумаваць па гасьцях. Любіла вельмі падарожнічаць, зьведваць розныя краіны сьвету, лавіць рыбу, расьціць кветкі, зьбіраць грыбы і г. д. Шмат удзяляла часу наведаньню тэатраў і розных музыкальных канцэртаў.

Нягледзячы на праблематычны стан здароў'я апошніх пару гадоў, пастанавіла, перад сьмерцю, наведаць родную старонку — Беларусь. З сумам і болем у душы глядзела на апустошаныя палеткі, дзе некалі стаяла родная хата. Сваёй візытай як-бы споўніла апошні абовязак перад Бацькаўшчынай.

Пакінула ў смутку мужа Віталія і дачку Леанілу. Многалюдныя паховіны адбыліся ў беларускай праваслаўнай царкве Сьв. Еўфрасіньні Полацкай у Саўт Рывэр. Цела спачыла на парахвіяльным магільніку у Саўт Рывэр.

Няхай ёй будзе пухам амэрыканская зямля, якая ветліва прыняла яе ў цяжкі паваенны час.

Рэдакцыя і Адміністрацыя "Бел. Думкі"

ХРОНІКА

2 чэрвеня 1990 г., у залі Беларуска-Амэрыканскага Грамадзкага Цэнтру, Саўт Рывэр, Н. Дж. адбыўся XI Кангрэс Беларусоў Амэрыкі на якім была выбрана ўправа Беларускага Канграсовага Камітэту Амэрыкі ў наступным складзе: **інж. Расьціслаў Завістовіч** — Прэзыдэнт, **Віталі Цярпіцкі** — Віцэ-Прэзыдэнт, **Кастусь Мерляк** — Віцэ-Прэзыдэнт, **інж. Міхась Бахар** — Віцэ-Прэзыдэнт, **Ірэна Рагалевіч-Дутко** — Віцэ-Прэзыдэнт і Культурны Рэфэрэнт, **Міхась Сенька** — Сакратар, **Леў Высоцкі** — Скарбнік, **Антон Даніловіч** — Старшыня Рады Кангрэсу, **Гэлена Касоўская** — Сакратар Рады, Рэвізыйная Камісія: **Мікалай Касьцюк, Міхась Палюховіч і Людміла Махнюк.**

САЎТ РЫВЭР

31 сьнежня 1990 г., у залі Грамадзкага Цэнтру адбылося многалюднае спатканьне Новага Году. Посьпеху навагодняга спатканьня садзейнічала выступленьне на ім зорак ансамблю **"Жывіца" — Валі Пархоменка** і **Алеся Казака.** Гасьцей вітаў **інж. Міхась Бахар.** Грала аркестра **Івана Альхоўскага.** Даход з спатканьня прызначаны на закуп неабходных мэдыкамэнтаў для суродзічаў на Бацькаўшчыне, пацярпеўшых ад Чарнобыльскае катастрофы.

Як і ў папярэднія гады, так і ў гэтым годзе 6 сту-

дзеня, пасьля Вячэрні, у залі Грамадзкага Цэнтру адбылася супольная Куцьця. Беларускі Грамадзкі Цэнтр зрабіў падарунак для ўсіх пэнсыянераў — парахвіян царквы імя **сьв. Еўфрасіньні Полацкай** — заплаціў за іх прысутнасьць на Куцьці. Традыцыйныя стравы падрыхтавала царкоўнае Сястрыцтва.

11 студзеня 1991 г. адбыўся гадавы сход сяброў Беларуска-Амэрыканскага Грамадзкага Цэнтру. Старшыня Цэнтру **Жорж Наумчык** у кароткіх словах схарактэрызаваў працу і дзейнасьць сяброў арганізацыі, як задавальняючай. У справаздачным годзе Цэнтр аховываў беларускім і мяйсцовым арганізацыям $5,950.00.

12 студзеня Беларуска-Амэрыканскі Грамадзкі Цэнтр зладзіў для сваіх сяброў і сымпатыкаў спатканьне Новага Году паводле старога каляндара. Гасьцей вітаў старшыня Цэнтру **Жорж Наумчык.**

13 студзеня ў залі Грамадзкага Цэнтру адбылася Ялінка для беларускіх дзяцей. Настаяцель царквы а. **Мячыслаў** прывітаў дзяцей, і адпяяньнем каляднага трапара распачалася праграма Ялінкі. Царкоўны хор пад кіраўніцтвам рэгента **Аўгена Скаўронскага** прапяяў для **дзяцей** і іх бацькоў цэлы шэраг беларускіх калядак, а **пасьля** дзеці пяялі калядкі для бацькоў. Падарункі для **дзяцей** і смачны пачастунак падрыхтавала царкоўнае сястрыцтва. Старшыня сястрыцтва сп-ня **Ірэна Дутко** вяла праграму Ялінкі.

3-га лютага ў залі Грамадзкага Цэнтру адбылася **выстаўка** фатаграфіяў газэтнага фоторэпарцёра з Менску **сп. Анатоля Клешчука.** На выстаўцы было больш **за 150** фатаграфіяў, тэматычна зьвязаных з цяперашнім жыцьцём у Беларусі. Выстаўку у прысутнасьці мастака-фатографа адчыніла сп-ня **Ірэна Дутко** — Віцэ-прэзыдэнт Беларускага Кангрэсавага Камітэту Амэрыкі па Культурных Справах.

10 лютага ў залі Грамадзкага Цэнтру адбыўся Агульны гадавы сход парахвіян царквы **сьв. Еўфрасіньні Полацкай.** На старшыню сходу быў выбраны сп. **Сьцяпан Наумчык**, на сакратара сп. **Міхась Сенька.** Пасьля здачы ўсіх справаздачаў і дыскусыяў быў прыняты бюдджэт на 1991 год у суме $60,000.00

3-га сакавіка Інстытут Навукі і Мастацтва ладзіў у Беларускім Грамадзкім Цэнтры Акадэмію з нагоды выхаду з друку твораў **Міхася Кавыля ("Міжагнёўе")** і ягонага юбілею.

16 лютага ў залі Цэнтру адбылося паседжаньня Рады Дырэктароў Рэлігійна-Адпачынковага Цэнтру Бэдэр-Менск. Старшынёю паседжаньня быў сп. **Кастусь Мерляк**, сакратаром сп. **Міхась Сенька.** Скарбнік рэсорту інж. **Сяргей Рагалевіч** здаў агульную справаздачу аб стане рэсорту і яго фінансавых магчымасьцях. Сэзон мінулага году прайшоў добра. Заплачаны ўсе рахункі і падаткі. Быў абгавораны плян працы на бягучы 1991 год.

На Запускі 16 лютага ў залі Цэнтру быў зладжаны сястрыцтвам традыцыйны беларускі абед — Бліны з верашчакай і ў іншых прыгатаўленьнях, які прынёс значны даход сястрыцтву. Гэты абед цешыцца добрай славай, а асабліва сярод нашчадкаў старое беларускае эміграцыі.

У нядзелю 17 сакавіка, у другую гадавіну съмерці старшыні Беларускага Кангрэсавага Камітэту Амэрыкі **сьв. пам. інж. Івана КАСЯКА**, у царкве сьв. Еўфрасіньні Полацкай **айцом Мячыславам** была адслужаа паніхіда.

Лекцыя праф. Ленінградзкага Інстытуту Культуры праф. Валентына ГРЫЦКЕВІЧА

Стараньнем Беларускага Інстытуту Літаратуры і Мастацтва і Абсальвэнтаў Ратгэрскага Унівэрсытэту ў пятніцу 15 сакавіка адбылася лекцыя ў Ратгэрскім Унівэрсытэце, Нью Брансвік, Н. Дж. ведамага беларускага дасьледніка і гісторыка **праф. Валентына Грыцкевіча на тэму: "Беларуская дасьледніцкая праца на Бацькаўшчыне". Праф. Грыцкевіч** прааналізаваў быўшую і цяперашнюю дасьледніцкую працу беларускіх навукоўцаў. Лекцыя выклікала ў слухачоў вялікую зацікаўленасьць лёсам беларускае гісторыяграфіі.

У нядзелю, 18 сакавіка 1991 г. ў залі Беларускага Грамадзкага Цэнтру мастачка **Ірэна Рагалевіч-Дутко** адчыніла 18-ю з чаргі Мастацкую Выстаўку.

У выстаўцы прынялі ўдзел наступныя мастачкі, мастакі і ўмельцы: **Іда Батэрворт, Ірэна Рагалевіч-Дутко, Мікола Дутко** (фатаграфіі), **Тамара Дутко, Анатоль Клешчук** (фотакараспаэнт іх Менску), **Надзя Кудасава, Мірэк Лучко, Людміла Махнюк, Таня Місюк, Аліса Махнюк, Алег Махнюк, Галіна Русак, Алесь Сільвановіч** (фатаграфіі), **Юля Андрусышына, Каця Влу, Галіна Брынкевіч, Таня Гэтман, Мікола Грэбень, Валя Кайнкова, Зора Кіпель, Ліза Літаровіч, Люда Літаровіч, Марыя Наумчык, Валя Рагалевіч, Ала Рамано, Патрыцыя Траскевіч, А. Сенінаў, Марыя Стагановіч, Хрысьціна Урыўская, Ірэна Вэрдэр, Ніна Згірская, Аўген Скаўронскі і Зоя Талмацэвіч.**

Ня ведаю чаму, але **Зоя Талмацэвіч** у "Даведнік" ня ўключана, а ў асобе **Зоі Талмацэвіч** мы маем выдатнага мастака-умельца. Яе вышыванкі — першакляснаыя працы, асабліва "Хлопчык з Лэсі...".

Ня думаў я даваць ацэнкі творчасьці мастачак і мастакоў, ня кажучы пра ўмельцаў, бо ніякі я ня эк-

спарту гэтым пытаньні, але і мне нешта падабаецца болей, а нешта меней, а таму хочацца адзначыць у першую чаргу буйную чаруюшчую каляровасьць пэйзажаў і натурморта **Людмілы М. К.**; птушкі, намалёваныя і выразныя, **Алега Махнюка.** Яго-ж выразаны з дрэва конь і воз, таксама намалёваныя разьюшаныя зубры, да якіх ажно страшна набліжацца. **Ірэна Рагалевіч-Дутко** — прафэсыянал, а таму і камэнтараў сваіх працаў не патрабуе. Тое-ж можна сказаць і пра прафэсыяналку **Іду Батэрворт.** Кінуўся мне ў вочы **Аўген Скаўронскі...** Наблізіўся і ўбачыў яшчэ **Лявона і Лізу Літаровічаў,** а пасьля і **Надзю Кудасаву.** Вельмі добра схоплены мастачкай **Таняй Місіюк.** Толькі **Надзя Кудасава** трохі не зусім падобная на сябе... У жыцьці яна выглядае шмат маладзейшай і прыгажэйшай. І малюе ня горш за іншых, але гэты раз выставіла малавата сваіх працаў. Шкада. **Галіна Русак** выдзяляецца мадэрнасьцю. Што яна жадала адлюстраваць у сваіх творах, я так і не дадумаўся. Давядзецца, бадай, пры спатканьні распытаць у мастачкі, бо загадкі мяне цікавяць. Зацікавіў і **Аўген Скаўронскі.** Ведаю яго як выдатнага рэгента, а ён яшчэ і добры мастак.

Цікавыя працы і рэшты, не адзначаных тут мастачак і мастакоў, у тым ліку і мастакоў-фатографаў. А з умельцаў падзяка надрукована ў "Даведцы" **Людміле Літаровіч** за ўдэкараваныя Вялікодныя яйкі... А, вось, за лапці, якія нехта плёў у Менску, падзякі няма...

Аглядальнік

У суботу, 22 сакавіка 1991 г., на шчаголе каля гарадзкой Управы Саўт Рывэра запалыхаў бел-чырвона-белы...

У нядзелю ў царкве імя сьв. Еўфрасіньні Полацкай а. Мячыслаў разам з а. Сьвятаславам адслужылі прынагадны малебен.

А трэцяй гадзіне па паўдні ў залі Грамадзкага Цэнтру інж. Міхась Бахар адчыніў сьвяточную Акадэмію ды пазнаёміў гасьцей — амэрыканцаў з сутнасьцю і значэньнем 25 Сакавіка.

Вельмі зьмястоўны рэфэрат прачытаў старшыня Канграсовага Камітэту Расьціслаў Завістовіч.

Мэр Саўт Рывэру А. Бразно прачытаў "Проклямэйшэн". Прамаўлялі два "каўнсулмэны"". Міхась Бахар прачытаў надасланыя прывітаньні ад беларускіх грамадзкіх арганізацыяй і ад першага старшыні Канграсовага Камітэту доктара М. Шчорса.

У мастацкай частцы выступілі паэты: Міхась Кавыль, Янка Золак і Вілачка. Царкоўны хор пад кіраўніцтвам рэгента Аўгена Скаўронскага мілагучна прасьпяваў "Магутны Божа" і чатыры папулярныя песьні.

На гэтым хор зьбіраўся сьпяваць беларускі гымн, але Міхась Бахар сказаў пачакаць. Доўга чакаць не давялося,, бо на сцэну выйшлі: кампазытар Аўген Магаліф і Аўген Скаўронскі і пацешылі прысутных песьнямі: "О, Нёман...", "Купалінка, купалінка" і "Сьпявае Данчык". Сьпяваў Аўген Скаўронскі, а на мадэрнізаваных цымбалах іграў Аўген Магаліф. Атрымаўся вельмі ўдалы, калі так можна сказаць, дуэт. Харысты ізноў зьбіраліся сьпяваць "Мы выйдзем шчыльнымі радамі", але неспадзявана ў залю зайшлі слаўныя беларускія "салаўі" — Валянтына, Алесь і Оленька Казакі. Пад крыкі і воплескі прысутных яны, па просьбе Міхася Бахара, прайшлі праз залю і апынуліся на сцэне. Алесь ня меў з сабою акардыёну, дык прысутны ў залі Іван Альхоўскі прапанаваў яму свой баян. І палілiся задушэўныя лірычныя і жартаўлівыя народныя песьні. Асабліва брала за сэрца песьня "Краіна вазёраў" і "Пташачка маленькая, якую прасьпявала малая Оля. Пасьля пачаўся пачастунак. Аднагалосна была прынята "Рэзалюцыя".

РЭЗАЛЮЦЫЯ прысутных на сьвяткаваньні 73-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці БНР.

Запазнаныя з фактычным становішчам Беларускага Народу ў БССР пастанавілі:

1. Пратэстуем супроць дзікае русыфікацыйнае палітыкі ў БССР.

2. Выказваем зьдзіўленьне і глыбокае абурэньне супроць рэклямаванай нядаўна савецкімі ўладамі гэтак званае амнэстыі, каторая пашыраецца толькі на крымінальныя праступленьні тых, хто вымардаваў тысячы нявінных сыноў і дачок Беларускага Народу, нядаўна знойдзеныя косьці каторых спачываюць у Курапатах ды іншых мясцох БССР.

3. Мы дамагаемся суровага пакараньня гэтых забойцаў.

4. Мы пратэстуем супраць выключэньня з з амнестыі тых, хто ў нялюдзкіх умовах нямецкай акупацыі стараліся адукаваць беларускіх дзяцей, пашырыць беларускую культуру, нясьці матэр'яльную й маральную дапамогу бяздомным, галодным і хворым.

5. Мы дамагаемся дзяржаўнасьці беларускае мовы не на паперы, але ў штодзённым жыцьці.

6. Мы дамагаемся, каб у г. зв. сувэрэннай беларускай рэспубліцы, школьніцтва ад па-

чатковага да вышэйшага ўлучна вялося ў беларускай мове, а ня было, як яно ёсьць сёньня, зарадзьдзем асыміляцыі.

7. Мы дамагаемся, каб цэрквы, касьцёлы і г. д. служылі беларускаму народу, а не ягоным ворагам.

8. Жадаем сапраўды вольнай прэсы, радыё і тэлявізыі.

9. Мы дамагаемся дэмакратызацыі жыцьця ў БССР з вольнымі, некантраляванымі выбарамі дзяржаўных і муніцыпальных устаноў.

24 сакавік 1991 год.

Саўт Рывэр, Н. Дж.

Сьвяткавальны Камітэт

КАНЦЭРТ СЯРЖУКА—ВОЮША

28 кастрычніка 1990 г. ў залі Грамадзкага Цэнтру пры царкве імя сьв. Еўфрасіньні Полацкай у Саўт Рывэры сабралася шмат беларусаў на канцэрт вядомага ў Беларусі барда Сяржука-Воюша.

Арганізавалі канцэрт БАЗА і Кангрэсавы Камітэт.

Вёў канцэрт рэдактар "Беларуса" Янка Запруднік.

Распачаўся канцэрт паказам фільма пра грамадзкую завіруху ў Менску. Вядомы слаўны Данчык Андрусышын непадражальна прасьпяваў некалькі песьняў, акампануючы сябе на гітары.

Сяржук-Воюш, як і належыцца барду, дэклямаваў свае вершы, сьпяваў рэчытатывам свае песьні доўгі час, аж пакулс не замяніў яго Аўген Магаліф, які, экампануючы сабе на піяніне, прасьпяваў некалькі песьняў свае кампазыцыі.

Пасьля ізноў удала сьпяваў патрыятычныя песьні Сяржук-Воюш.

У канцэрце прымаў удзел танцавльны ансамбль "Васілёк".

Была разыграна латарэя. А на завяршэньне — пачастунак.

НА ВЫДАВЕЦКАЙ НІВЕ

Інжынер Іван Касяк — "Гісторыя Беларусі" (у ангельскай мове), цана 25 даляраў.

Беларускі Інстытут навукі і мастацтва (Нью Ёрк) выдаў выбраныя творы **Міхася Кавыля — "Міжагнёўе"**.

АХВЯРЫ НА "БЕЛАРУСКУЮ ДУМКУ"

У. Т.	$100.00
Юрка Кіпель, М. Д.	$75.00
Браніслаў Даніловіч	$50.00
А. Тэлеш	$40.00
М. Тулейка	$20.00
К. В.	$20.00
А. Протас	$20.00
[illegible]. Гутырчык	$20.00
Ж. Наумчык	$20.00
Э. Пітушка	$10.00
В. Стаўпецкі	$10.00
П. Зыбайла	$10.00
П. Мельяновіч	$10.00
Ю. Андрусышын	$10.00
А. Ерамёнак	$10.00
Я. Юхнавец	$10.00
П. Грыгальчык	$10.00
Н. Вайцяхоўскі	$10.00
М. Палюховіч	$10.00
М. Сенька	$131.00
В. Дзеркач	$5.00
Л. Літаровіч	$5.00
П. Гуз	100.00 аўстр. дал.
Ю. Хахолка	20.00 англ. чунт.
В. Сідарэвіч	20.00 англ.фунт.
В. Ермалінскі	20.00 англ. фунт.
А. Гатковіч	10.00 англ. фунт.
Е. Мацкевіч	10.00 англ. фунт.
П. Грыгальчык	5.00 англ. фунт.

Усім ахвярадаўцам — шчырае дзякуй!

СЬВ. ПАМ. Ул. ШУЛЬЖЫЦКІ

31 сакавіка 1981 году ў горадзе Нью Брансвік, Н. Дж., пасьля кароткай хваробы, памёр сьв. п. Ўладыслаў Шульжыцкі. Нябошчык нарадзіўся 5 сьнежня 1917 г. ў вёсцы Шутавічы, каля Маладэчна. Быў актыўным беларусам. Сьпяваў у царкоўных і сьвецкім хорах. Пакінуў у смутку і жалобе жонку Аленю, сына Аляксандра і дачок — сябровак беларускага танцавальнага гуртка "Васілёк" — Уршулю і Таню. Вечная яму памяць!

ЗЬМЕСТ

72-я ўгодкі 25-га Сакавіка — *Р. Завісловіч*	1
Рэзалюцыя	4
Ліст у ЦК кампартыі	5
Пастанова Польскага Сэнату	5
19-я Сустрэча Беларусаў... — *М. Панёманскі*	6
У абарону праўды — *В. Цярпіцкі*	7
І на чужыне помніў Беларусь — *Я. Золак*	9
Вершы — *Лявон Слуганін*	9
Памылкі друку ў вершах Л. С. (Б. Д. №35)	12
"Жыцьцё" — *П. Грыгальгык* (верш)	12
"Ціхі стаў" — *Я. Золак* (аповесьць)	13
"Зьдзічэлае рэха вясны — *А. Хатэнка*	16
"Із агню ды ў полымя" — *М. Кавыль*	20
Мой побыт на Беларусі — *А. Гатковіч*	24
Верш — *Н. Артымовіч*	28
Праступны выбрык Ватыкана	28
Парасткі Галоснасьці	29
Ансамбль "Жывіца" ў Саўт Рывэры	29
З майго Юбілейнага вечара — *М. Кавыль*	30
Сьв. Пам. Ж. Цярпіцкая	31
Хроніка	32
Канцэрт Сяржука - Воюша	35
На выдавецкай ніве	35
Ахвяры на "Беларускую Думку"	35

Рэдакцыйная Калегія: М. Бахар, Ул. Брылеўскі, А. Даніловіч, а. протапр. С. Коўш, В. Цярпіцкі і М. Кавыль (Галоўны Рэдактар)

Адрас Рэдакцыі: "Byelorussian Thought" Whitehead Ave., P.O. Box 26 South River, New Jersey, 08882 USA

Выдавец: — Беларускае Выдавецкае Таварыства: І. Шчорс — старшыня , М. Сенька — сакратар, М. Палюховіч — скарбнік.